ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДАНЬНЯ XV
№ 148 (4400)
Панядзелак, 4 ліпеня 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ—Прамова тав. Кагановіча—ключ да перабудовы работы прафсаюзаў.—П. Г.—Словы і справы пляўцоў «маральнага разбраенньня» (2 стар.).
Аб фактах адмаўленьня ад выкананьня дырэктыў аб адпраўцы тавараў у сяло дырэктарам аб'яднаньня НКСнабу «БелКМО» т. Быхаўскім.—Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б (1 стар.).
Аб скліканьні 3-й сэсіі ЦВК БССР X скліканьня. (1 стар.).
АГЛЯД ДРУКУ:—Намёк калгаснікаў па адрасу рэдакцыі (3 стар.).
Баявыя тэмпы перадавых гарадоў —рэалізацыі пазыкі на вёсцы (1 ст.)
Свячасова ўбраць 1.850 тыс. га сенажаці (1 стар.).
КПП і КПЗБ арганізуюць адпор фашыстам, якія рыхтуюць інтэрвэнцыю супроць СССР (2 стар.).
Максымум увагі камуністычнаму выхаваньню падрастаючага пакаленьня (3 стар.).
ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).
Адкрылася VII усесаюзная канфэрэнцыя ЎсеЛКСМ (4 стар.).
ЗА МЯЖОЙ. Агляд ваенна-фашысцкіх сіл (4 стар.).
Белагвардзейцы абмяркоўваюць у Лёндане новыя антысавецкія правакацыі (4 стар.).

Прамова тав. КАГАНОВІЧА--ключ да перабудовы работы прафсаюзаў

IX-ы ўсесаюзны зьезд прафсаюзаў падвёў вынікі вялікаму этапу ў разьвіцьці савецкага прафруху — пэрыяду пасьля VIII-га зьезду. У гэты пэрыяд у бязьлітаснай барацьбе з праваапартуністычнымі элемэнтамі, пад кіраўніцтвам партыі, праведзена рашучая перабудова прафсаюзнай работы. Лёзунг «тварам да вытворчасьці» ў канцэнтраваным выглядзе вызначыў задачы прафсаюзаў у новых умовах гаспадарчай абстаноўкі. Зрабіўшы сацспаборніцтва асноўным зьвяном работы, прафсаюзы павялі мільёны рабочых у сацыялістычнае наступленьне па выкананьні пяцігадовага пляну за чатыры гады.

Тыя вялізарныя перамогі, якіх дабіліся прафсаюзы на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, зьяўляюцца вынікам значнай перабудовы работы, няўхільнай барацьбы з апартуністамі.

Пастановы XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі паставілі перад прафсаюзамі рад новых задач. Аднак, нельга сказаць, што практычная работа прафарганізацый узнялася па ўзровень гэтых задач.

IX-ы зьезд прафсаюзаў адзначыў, што яшчэ да канца не пераможаны праваапартуністычныя трэд'юніяністыкія і «лявацкія» скажэньні ў рабоце паасобных прафарганізацый. Аб жывучасьці апартуністычных элемэнтаў і іх супраціўленьні сьведчаць надзвычай павольныя тэмпы работы многіх арганізацый, адсутнасьць належнай увагі і канкрэтнага кіраўніцтва сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарніцтвам, слаба пастаўленая тарыфна - шармовачная работа, зусім неыстарчальная барацьба з ўраўнілаўкай, далёка неыстарчальная работа па абслугоўваньні культурна - бытавых запатрабаваньняў працоўных мас. Гэтыя недахопы зьяўляюцца тормазам на шляху выкананьня задач, пастаўленых перад прафсаюзамі XVII усесаюзнай партканфэрэнцыяй і 6-ю ўмовамі тав. Сталіна.

Сутнасьць работы прафсаюзаў на даным этапе, з вычарпальнай паўнатой разгорнута ў выступленьні тав. **Кагановіча** на 9-м усесаюзным зьезьдзе прафсаюзаў. Гэта выступленьне зьяўляецца ўзорам канкрэтнага кіраўніцтва ленінскага ЦК прафэсыянальным рухам, яна дае разгорнутую праграму работы кожнай прафэсыянальнай арганізацыі на даным этапе.

Тав. Кагановіч даў рэзкі адпор антыпартыйным поглядам аб непатрэбнасьці прафсаюзаў у другой пяцігодцы, наколькі будуецца бясклясавае сацыялістычнае грамадзтва. Гэтыя погляды адбіваюць апартуністычную ўстаноўку аб тым, што шлях да бясклясавага грамадзтва ляжыць праз патуханьне клясавай барацьбы, праз аслабленьне пралетарскай дыктатуры. Барацьба за стварэньне бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва павінна быць злучана з задачай узмацненьня дыктатуры пралетарыяту, а адсюль выцякае вялізарнае павялічэньне ролі прафсаюзаў, як стажавога хрыбта пралетарскай дыктатуры, як школы камунізму, што перавыхоўвае дзесяткі мільёнаў працоўных у сьвядомых і актыўных будаўнікоў сацыялізму.

Лёзунг «тварам да вытворчасьці» быў і застаецца цэнтральным лёзунгам прафработы. Тав. Кагановіч асабліва падкрэсьліў спэцыфічныя задачы прафсаюзаў у ажыцьцяўленьні гэтага лёзунгу. «Прафсаюзы павінны канцэнтраваць увагу на цэнтральных зьвеньнях, якія вырашаюць на даным этапе посьпех іх работы. Гэта — пытаньні зарплаты, завяршэньне барацьбы з «лявацкай» ураўнілаўкай, арганізацыя тэхнічнага нармаваньня і рашучая барацьба за няўхільнае паляпшэньне матар'яльнага і культурна-бытавога становішча рабочых мас». (Перадавая «Большевика»). «Іменна адсюль павінны прафсаюзы ісьці да вытворчых пытаньняў» (**Каганові́ч**).

Прафсаюзы БССР дабіліся пэўных посьпехаў у ажыцьцяўленьні лёзунгу «тварам да вытворчасьці», у кіраўніцтве ўдарным рухам. Калі ў верасьні 1929 году было ахоплена сацспаборніцтвам 3 проц. рабочых, дык зараз — 69. Сацспаборніцтва стала асноўным фактарам барацьбы за прамфінпляц. Значнае разьвіцьцё атрымалі гаспадарчыя разрахунковыя брыгады — вышэйшая форма сацспаборніцтва.

Калі ў лістападзе 1931 году налічвалася 838 гаспадарча - разрахунковых брыгад, дык зараз на 1 мая мы ўжо маем каля 3.700 брыгад, якія ахапляюць 27,7 проц. рабочых. Большасьць гаспадарча - разрахунковых брыгад паказваюць узоры бальшавіцкай барацьбы за вытворчую праграму, за якасьць работы, за выкананьне 6 умоў.

Сіла гаспадарча - разрахунковых брыгад у тым, што, рэалізуючы на справе 6 указаньняў тав. Сталіна, злучаючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва з матар'яльнай зацікаўленасьцю, вырашаючы такія важныя задачы, як барацьба за арганізацыю працы, ўнутрызаводскія накапленьні, брыгады найбольш поўна забясьпечваюць узьдзейнасьць рабочых на ход вытворчасьці.

Аднак, яшчэ ёсьць шмат істотных недахопаў у разгортваньні вышэйшых форм сацспаборніцтва. З 101 прадпрыемства толькі 38 ужываюць зьменна-сустрэчнае пляніраваньне. Нездавальняюча пастаўлена апэрацыйнае, штодзённае кіраўніцтва і дапамога гаспадарча разрахунковым брыгадам. На Магілеўскай шаўковай фабрыцы, напрыклад, фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі», на Бабруйскім камбінаце вельмі слаба забясьпечан улік эфэктыўнасьці работы брыгад. На Магілеўскай гарбарні брыгады доўгі час існавалі толькі на паперы.

Ёсьць выпадкі падмены, дубляваньня работы гаспадарчых органаў, парушэньня адзіначальня з боку прафарганізацыі БССР, імкненьня заняцца ўсімі пытаньнямі вытворчасьці. Тут мы маем яўнае скажэньне, неразуменьне задач прафарганізацый.

Мацаваць тарыфную дысцыпліну, не дапушчаць перавыдаткаваньня фондаў зарплаты, арганізаваць пільны кантроль за рэалізацыяй двухбаковых абавязацельстваў, укараняць простую нелабмежаваную зьдзельшчыну і прагрэсыўна - прэміяльную сыстэму на паасобных вядучых вучастках, дзе гэта мэтазгодна, упрадкаваць тэхнічнае нармаваньне — вось тое асноўнае ў рабоце саюзаў у галіне перабудовы сыстэмы зарплаты і рэалізацыі 6-ці ўмоў тав. Сталіна, што выцякае з пастаноў IX-га ўсесаюзнага зьезду прафсаюзаў і дырэктыў партыі, падкрэсьленых у прамове тав. **Кагановіча.**

Прафсаюзы БССР не дабіліся яшчэ рашаючых посьпехаў у гэтай галіне. Наглядаюцца факты значнага перавыдаткаваньня фондаў зарплаты.

Віцебскі «Чырвоны мэталіст» у першым квартале перавыдаткаў 80 тыс. руб. На шчотачным камбінаце перавыдаткавана 52 тыс. руб., на заводзе «Камунар» — 60 тыс. руб. Гэта гаворыць аб зусім невыстарчальнай арганізацыі працы і перабудове сыстэмы зарплаты. Яшчэ далёка ня ўсё зроблена, каб ліквідаваць ураўнілаўку. Высока кваліфікаваныя рабочыя вядучых прафэсій часта атрымліваюць меншую зарплату, чым рабочыя больш нізкіх кваліфікацый, з меншай удзельнай вагой на вытворчасьці. На торфазаводзе «Бальшавік» брыгады, якія перавыконвалі плян і па - бальшавіцку змагаліся за перамогу, атрымлівалі зарплату меншую, чым брыгады, якія выконвалі толькі 18-20 проц. заданьня. Яркім прыкладам дрэннага кіраўніцтва служыць работа заўкому мазырскага лесапільнага заводу «Пралетары». Толькі ў канцы мая былі на заводзе пераглядваны нормы і расцэнкі. На радзе рашаючых вучасткаў яшчэ ня ўведзена зьдзельшчына. Майстар 4-га разраду атрымліваў 2 р. 45 кап., а 3-га разраду — 5 р. 21 кап. Былі выпадкі, калі рабочым зьдзельшчыкам ня выплачвалі за ўсе дні работы, бо ўлік быў кепска наладжан. Рабочы Гарошка ў красавіку страціў такім чынам 11 дзён. Былі агідныя выпадкі, калі дырэктар пры выплаце зарплаты самавольна зрэзаў заработак адных рабочых, а павялічваў другіх. Дзе быў заўком? Можа ён лічыў, што нельга ўмешвацца ў гэту справу, «парушаць прынцып адзіначальня».

На прадпрыемствах БССР нездавальняюча праводзіцца барацьба за тэхнічнае нармаваньне, як адзін з элемэнтаў правільнай перабудовы зарплаты і ператварэньня яе ў вагар павышэньня прадукцыйнасьці працы.

На заводзе імя Варашылава процант ахопу рабочых тэхнарманаваньнем складае 10, на заводзе «Ударнік»—9.

Ня дублюючы работы гаспадарпікаў, выбіраючы асноўныя зьвеньні, увязваючы канкрэтныя патрэбы кожнага паасобнага рабочага з інтарэсамі прадпрыемства ў цэлым, прафарганізацыі могуць і павінны дабіцца ў самы кароткі тэрмін рашаючых посьпехаў у галіне перабудовы зарплаты. «У пытаньнях зарплаты, напрыклад, і пармаваньня вы маеце ўладу на 100 проц., вы можаце ўсе пытаньні вырашыць» — адказаў тав. Кагановіч гэтым прафработнікам, якія хныкалі, што ў іх «мала ўлады».

З выключнай вострасьцю паставіў тав. Кагановіч пытаньне аб увазе прафсаюзаў да патрэб паасобных рабочых, да дробязяй рабочага быту.

У пэўнай адпаведнасьці з гэтым IX зьезд прафсаюзаў адзначыў, што лёзунг «тварам да вытворчасьці» патрабуе самых уважлівых, самых клапатлівых адносін да рабочага, да яго канкрэтных запатрабаваньняў і запытаньняў. Толькі апартуністы, толькі людзі, што знаходзяцца ў палоне меншавіцкай ідэалёгіі, могуць цьвердзіць, што лёзунг «тварам да вытворчасьці» супярэчыць бальшавіцкай абароне прафсаюзных мас ад бюракратычных скажэньняў, якія яшчэ маюць месца.

Чаго варта работа рэчыцкіх прафарганізацый, дапусьціўшых заняцьце культурнага асяродку — клюбу РКІД — пад праўленьне ЦРК, ігнараваўшых культурныя патрабаваньні працоўных мас? Якой ацэнкі заслугоўвае работа заўкому заводу «Пралетары», што дапусьціў, каб адміністрацыя самавольна «з левай нагі» павышала і зьніжала расцэнкі.

Умець злучаць барацьбу за выкананьне гістарычных гаспадарчых задач са штодзённым змаганьнем за паляпшэньне матар'яльнага і культурна - бытавога становішча рабочага і яго сям'і, за задаваленьне яго рашучых патрабаваньняў — першая задача прафсаюзаў.

Паляпшэньне рабочага снабжэньня, грамадзкага харчаваньня, работы ЗРК, барацьба за разгортваньне калгаснага гандлю і самазагатовак, разьвіцьцё прыгарадных гаспадарак, трусагадоўлі — павінны стаць прадметам штодзённых клопатаў прафэсыянальных арганізацый.

У часе сталінскага паходу многія прафарганізацыі БССР дабіліся посьпехаў і паляпшэньня рабочага снабжэньня і грамадзкага харчаваньня (за вод імя Ланцуцкага, «Беларусь», «Чырвоная Бярэзіна», менская абутковая фабрыка і інш.) Пабудаваны новыя сталоўкі, сьвінарнікі, трусатнікі, арганізаваны гароды, наладжан рабочы кантроль за работай ЗРК, адкрыты калгасныя ларкі па заводах і інш. Аднак, ёсьць рад прафарганізацый, дзе рабочае снабжэньне лічыцца другараднай справай. Аб гэтым гаворыць пастанова ЦК КП(б)Б аб рабоце ЗРК фабрыкі «Кастрычнік». Фабком «Кастрычніка» не наладзіў належнага кантролю за работай свайго ЗРК. Прафсаюзныя арганізацыі менскай шчотачнай фабрыкі мала клапоцяцца аб адшуканьні дадатковых рэсурсаў для снабжэньня рабочых.

Побач з барацьбою за паляпшэньне матар'яльнага становішча рабочых незьмерна вырастаюць задачы выхаваньня рабочых мас у сувязі з ростам новых кадраў рабочых. Аб тым, як нельга праводзіць работу з новымі кадрамі, сьведчаць даныя аб працы заўкому мазырскага заводу «Пралетары». Там новыя рабочыя на працягу некалькіх месяцаў ня ведалі, чым займаецца заўком і дзе ён знаходзіцца.

Прамова т. Кагановіча на зьезьдзе прафсаюзаў зьяўляецца ключом да далейшай перабудовы работы прафсаюзаў. Яна поўнасьцю вызначае шляхі работы на даным этапе. Гэта прамова павінна быць вядома кожнаму прафработніку, кожнаму рабочаму, кожнаму працоўнаму.

БАЯВЫЯ ТЭМПЫ ПЕРАДАВЫХ ГАРАДОЎ —РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ!

„Камунарка" адказвае камбінату „Спартак" посьпехамі ў рэалізацыі

«Ваш ліст з патрабаваньнем аб выкананьні ўзятых намі абавязацельстваў па спаборніцтве зьявіўся стымулам для самаправеркі і падцягваньня ў галіне рэалізацыі пазыкі.

Асноўная наша памылка ў тым, што праведзеная падрыхтоўка і добра разгорнутая работа ў першыя дні падпіскі ня былі замацаваны і фарсаваны ў наступныя дні. Ноччу з 9 на 10 чэрвеня было ахоплена падпіскай 40 проц. рабочых двух цэхаў. Цэх дражжэй ў часе праведзеньня агульна-фабрычнага мітынгу 10 чэрвеня ахапіў падпіскай амаль усіх рабочых на месячны заработак. 10 чэрвеня ўвечары на пашыраным пленуме гарсавету, гарпрафсавету мы мелі магчымасьць рапартаваць аб рэалізацыі пазыкі на 36.500 рублёў. Аднак, першыя посьпехі ня былі замацаваны, тэмпы аслабілі, і гэта прывяло да адставаньня.

Другая грубая памылка, дапушчаная намі — гэта ігнараваньне ўліку падпіскі, што адмоўна адбілася на ўсёй рабоце, бо нельга было рэагаваць і свячасова падцягваць адсталыя вучасткі.

Дапушчаныя памылкі ўлічаны і выпраўлены на-хаду. Мы вылучылі брыгаду для азнаямленьня з пастаноўнай масавай работы на вашым камбінаце.

Зараз мы можам рапартаваць аб ахопе падпіскай 96 проц. рабочых — з 1.069 — 1.019; аб рэалізацыі пазыкі на суму 100.500 руб., што складае звыш 100 проц. месячнага фонду зарплаты.

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі мы справімся з задачамі, пастаўленымі перад намі».

Ліст прынят на агульна-фабрычным мітынгу «Камунаркі»; на ім праведзена дадатковая падпіска, якая дала 1.520 руб.

ЗВОДКА

рэалізацыі пазыкі „4-га завяршальнага году пяцігодкі" на 1 ліпеня 1932 году (у тыс. руб.)

Назва раёнаў	Рабочыя і служач.		Інш. гар. насельн.		Калгаснікі		Адна-асобнікі		РАЗАМ	
	Сума	Проц.	Сума	Проц.	Сума	Проц.		Сума	Проц.	
Аршанскі	1263	101,0	193	102,2	255	65,0	29	1740	92,0	
Асіповіцкі	183	58,1	1	1,7	29	39,7	—	213	35,4	
Асьвейскі	24	30,0	—	—	—	—	—	24	14,8	
Бабруйскі	1978	83,8	323	72,4	44	36,6	12	2452	76,5	
Барысаўскі	1142	76,1	59	45,4	45	33,3	10	1256	62,5	
Бешанковіцкі	110	55,0	1	4,0	27	17,8	—	138	27,2	
Браслаўскі	63	54,7	—	—	14	22,2	—	77	26,8	
Б.-Копылаўскі	64	80,0	—	—	22	36,7	—	86	35,2	
Быхаўскі	227	64,9	33	55,0	10	7,0	—	270	32,9	
Гарадоцкі	63	84,0	—	—	2	2,2	1	66	31,9	
Бялыніцкі	116	104,5	26	100,0	8	6,0	—	149	38,7	
Бярэзінскі	66	60,0	—	—	5	5,5	—	71	17,5	
Веткаўскі	154	77,0	43	47,8	22	22,4	1	220	32,5	
Вушачскі	51	60,7	—	—	11	9,9	—	62	21,7	
Гарадоцкі	130	36,6	—	—	1	—	—	131	15,1	
Глускі	131	50,4	36	59,0	20	25,0	—	187	33,6	
Горацкі	322	63,1	32	39,0	30	16,7	—	384	38,3	
Дрыбінскі	194	121,3	14	46,7	31	41,3	—	239	71,7	
Дубровенскі	175	58,3	13	18,6	33	29,5	—	221	34,3	
Ельскі	92	70,7	—	—	33	46,4	—	125	36,1	
Жлобінскі	203	101,5	50	56,8	7	17,0	—	270	43,1	
Жыткавіцкі	96	120,0	4	100,0	9	22,5	—	109	75,5	
Заслаўскі	125	142,5	14	93,4	17	25,4	—	156	73,2	
Камарынскі	43	33,1	5	71,4	5	10,0	—	53	21,5	
Карманскі	76	180,6	5	23,8	12	12,0	—	90	27,0	
Касцюковіцкі	158	67,2	—	—	7	2,0	—	165	23,3	
Клімавіцкі	289	80,3	34	66,7	194	79,8	—	517	70,7	
Клічаўскі	75	71,4	—	—	30	40,5	—	105	22,8	
Койданаўскі	245	144,1	44	110,0	82	82,0	24	395	104,7	
Капыльскі	146	78,9	11	27,5	11	7,8	—	168	34,8	
Чырвонапольскі	55	110,0	—	—	—	—	—	55	19,1	
Крупскі	103	54,2	10	35,7	10	7,7	—	123	24,4	
Крычаўскі	221	66,6	9	26,4	14	15,5	—	244	41,5	
Лагойскі	90	112,5	2	33,3	25	31,3	—	117	45,7	
Лёзьнянскі	197	87,6	4	16,7	128	71,9	1	330	57,6	
Лепельскі	78	91,7	—	—	3	14,2	—	81	39,7	
Лепёльскі	120	64,9	9	56,3	60	33,3	—	189	44,9	
Лосўскі	53	88,3	3	7,0	7	8,0	—	63	21,0	
Любаньскі	178	127,1	6	85,7	20	40,0	—	204	72,9	
Маліноўскі	1771	69,2	211	54,8	75	45,5	—	2057	59,9	
Мазырскі	700	114,8	71	45,0	19	19,0	2	792	73,1	
Мсьціслаўскі	185	112,1	29	60,4	105	61,8	5	324	65,6	
Нараўлянскі	73	81,1	1	3,3	19	—	—	93	30,2	
Парыцкі	100	100,0	29	70,7	27	30,0	—	156	39,8	
Пятрыкоўскі	291	100,3	21	23,3	22	26,2	—	334	49,2	
Плешчаніцкі	136	75,5	8	53,3	12	24,0	—	156	49,5	
Полацкі	740	74,0	88	67,7	69	43,7	—	897	56,5	
Прапойскі	70	77,7	—	—	4	3,4	—	74	22,2	
Пухавіцкі	275	101,8	44	41,9	22	20,0	—	341	42,9	
Рагачоўскі	324	87,6	38	54,2	35	35,7	—	397	47,8	
Расонскі	103	158,5	—	—	4	8,9	—	107	43,3	
Рэчыцкі	773	80,5	—	—	19	11,3	—	792	50,7	
Сенненскі	109	83,8	—	—	12	12,4	—	121	29,1	
Сіроцінскі	183	110,9	13	100,0	71	52,0	—	267	57,9	
Слуцкі	458	89,9	71	78,9	90	51,7	1	520	66,7	
Смаргонскі	157	65,4	—	—	—	—	—	157	30,1	
Старадарожскі	124	103,3	9	42,8	8	14,5	—	141	42,7	
Старобінскі	125	166,7	10	83,3	58	89,2	—	193	74,5	
Сураскі	62	35,4	—	—	21	26,9	—	83	18,7	
Талачынскі	158	92,9	18	36,0	11	5,1	—	187	31,3	
Тураўскі	77	128,3	6	50,0	10	31,3	—	93	58,1	
Уваравіцкі	91	65,0	2	4,2	2	3,0	—	95	24,1	
Вуншдзенскі	72	68,5	—	—	—	—	—	72	27,9	
Хойніцкі	169	80,5	—	—	5	5,4	—	174	38,2	
Церакаўскі	142	109,2	—	—	83	56,1	10	235	41,4	
Чашскі	147	73,4	12	35,3	51	44,0	1	211	33,2	
Чечэрскі	50	50,0	—	—	—	—	—	50	15,7	
Чашніцкі	135	71,0	11	30,6	12	9,6	—	158	35,0	
Чыр.-Слабодзкі	88	117,3	—	—	16	42,1	—	104	55,5	
Чэрвеньскі	181	62,4	—	—	21	38,1	—	202	38,6	
Чэрыкаўскі	77	70,0	12	60,0	74	64,3	—	163	53,4	
Шкловскі	223	81,1	—	—	47	31,8	—	270	43,1	
Гомель	4719	100,4	310	42,6	62	44,9	—	5090	89,1	
Віцебск	4096	88,1	396	60,9	—	—	—	4492	79,8	
Менск	7858	90,3	570	67,2	148	60,9	5	8582	86,2	
Усяго	34.011	80,4	2926	48,8	2469	29,4	102	32508	58,5	
Апрача таго рэалізавана сярод рабочых і служачых чыгункі	4.850	—	—	—	—	—	—	4850	—	
Разам па БССР	38.861	86,4	2926	48,8	2469	29,4	102	44358	63,2	

Начальнік кіраўніцтва ашчадкасамі і дзяржкрэдыту БССР ЗАХАРАВА.

Калгаснікі «Барацьбіта за сацыялізм» Строчацкага сельсавету т. т. ПАРХІМОВІЧ і ПАСТУШОНАК, якія падпісаліся на пазыку на 125 р. кожны

Скончылі падпіску

Рапарт заводу Імя Варашылава

Чырвонасьцяжны завод імя Варашылава да 1-га ліпеня выканаў свае абавязкі перад дзяржавай. На 1 ліпеня рэалізавана пазыкі імя 4-га завяршальнага году пяцігодкі на 100,8 проц. месячнага фонду. Зарплата 1.193 рабочых складае ў месяц 150.200 руб. Падпісаліся 1.135 чал. на суму 151.450 руб. Падпіска працягваецца.

Ударная работа жаночых брыгад

КОЙДАНАВА. ЖАНОЧЫ АКТЫЎ ГОРАДУ ПАКАЗАЎ УЗОРНЫЯ ПРЫКЛАДЫ РАБОТЫ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ. БЫЛІ ВЫЛУЧАНЫ 4 БРЫГАДЫ НА ЧАЛЕ З т. т. СЯМЁНАВАЙ, АНОСАВАЙ, ПАТАПАВАЙ І БАЙДАК. ЯНЫ НА ПРАЦЯГУ 2-х ДЗЁН РЭАЛІЗАВАЛІ ПАЗЫКІ СЯРОД ХАТНІХ ГАСПАДЫНЬ НА 3.000 РУБ. НЕАБХОДНА, КАБ УДАРНЫЯ ЖАНОЧЫЯ БРЫГАДЫ ЎЗЯЛІ НА БХЖСІР АДСТАЮЧЫЯ КАЛГАСЫ І АДНААСОБНІКАЎ. ТРЭБА ЎЦЯГНУЦЬ ЖАНОЧЫ АКТЫЎ, ЯКІ ПРАЯВІЎ СЯБЕ Ў РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ, У РАБОТУ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ СРОДКАЎ І ВЯРБОЎЦЫ ЎКЛАДЧЫКАЎ У АШЧАДКАСЫ.

БРЫГАДА ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА І НКФ БССР — ПЭРЭЛЬМАН, ЗМАЧЫНСКІ.

Пяцідзеньнік праверкі гатоўнасьці да ўборкі

Свячасова ўбраць 1.850 тыс. га сенажаці

Ці адказвае сэктар зямляўпарадкаваньня Наркамзему за сенаўборку?

Дзе і каму касіць? Гэтага адказу ча каюць ня толькі ў лугтасе «Ведрыч», Рэчыцкага раёну, дзе адміністрацыйны запал кіраўніка сэктару зямляўпарадкаваньня НКЗ Шчарбакова прывёў у замяшаньне і работнікаў і работнікаў земаддзелу (глядзі «Зьвязду» ад 1-га ліпеня).

Дзе касіць дагэтуль ня ведаюць і ў буйнейшым лугтасе «Загалье», Любаньскага раёну. Наколькі нам вядома да 28 чэрвеня лугтасу ня былі адведзены граніцы.

Большасьць раёнаў ня скончылі адводу сенажацяй. Касны ідуць літаральна па пятах каморнікаў, якія ледзь спраўляюцца з работай. У Рэчыцкім раёне, напрыклад, на кожнага каморніка прыпадае па 7 сельсаветаў. У лепшым выпадку, адвод сенажацяй там будзе скончан не раней 10 ліпеня. Такое-ж становішча ў Любаньскім, Бабруйскім і ў радзе іншых раёнаў.

Што-ж робіць сэктар зямляўпарадкаваньня НКЗ? Як ён рэагуе на шматлікія тэлеграфныя запытаньні з месц? Наркамзем шле тэлеграмы: «Да 10 ліпеня ўладзіць усе спрэчкі па адводзе сенажацяй»... і лічыць, што гэтым ужо вырашана пытаньне.

Да рэчы, на сыгналы «Зьвязды» з Рэчыцкага раёну НКЗ да ўчарашняга дня не рэагаваў. У буйнейшым лугтасе «Ведрыч» так і ня ведаюць, як выйсьці з таго становішча, у якое завяла мясцовыя арганізацыі, лугтас і калгасы тэлеграма Шчарбакова.

Час ня чакае. Травы пачынаюць перасьпяваць. Адвод сенажацяй трэба закончыць не пазьней як у бліжэйшыя 5 дзён. Між тым каморнікі, якія ёсьць на мясцох, самі ня ў стане справіцца з гэтай задачай.

Мы прапануем бездакладна перакінуць на гэтую работу ўсіх каморнікаў, якія працуюць у цэнтральных установах і студэнтаў зямляўпарадчага інстытуту з Горак. **Нізодкага дня не марудзіць больш з адводам сенажацяй.**

Завоз складаных сена-ўборачных машын выканан па сенажасілках—на 32 проц., а па граблях—на 29 проц. Гэта вымушае максымальна скарыстаць з поўнай нагрузкай тыя машыны, якія ў нас ёсьць. Між тым, каля 2 тыс. сенажасілак ня могуць быць закончаны рамонтам з-за адсутнасьці запасных частак.

Выраб гэтых частак перададзены Аршанскаму і Бабруйскаму заводам і Менскім майстэрням інвалідных каапэрацый. Дагэтуль заказ выканан менш, чым на 10 проц.

Ніякіх аб'ектыўных прычын для затрымкі выробу запасных частак няма, бо заводы і майстэрні забясьпечаны неабходным сыр'ём. Справа толькі ў людзях, якія ня хочуць зразумець, што кожны дзень замаруджаньня выробу запасных частак пагражае нам стратамі тысяч цэнтн. каштоўных кармоў, накосіць угар па кармовай базе жывёлагадоўчых гаспадарак.

Мы патрабуем ад упаўнаважанага Наркамзему і трыкутнікаў вышэй паказаных прадпрыемстваў безадкладна ўжыць меры да фарсаваньня выробу запасных частак і адгрузкі іх на склады Белсельснабу.

Пры недахваце сенаўборачных машын мы разам з тым маем такія выпадкі, калі завезеныя складаныя машыны не скарыстоўваюцца. Напрыклад, у лугтасе «Ведрыч», як мы ўжо адзначалі, трактарныя сенажасілкі стаяць нярухома. **У Нараўлі на складах ляжаць ня рэалізаваньні тысячы кос.** Такога становішча далей дапускаць нельга. Белсельснаб і Наркамзем павінны безадкладна перакінуць гэтыя машыны туды, дзе ў іх адчуваецца вострая патрэба.

Трэба падкрэсьліць, што нашы саўгасы і калгасы забясьпечаны сенаўборачнымі машынамі няроўнамерна. Гэта вымагае ў бліжэйшыя-ж дні па меры разгортваньня сенаўборкі арганізаваць работу так, каб плянамерна скарыстаць усе машыны, арганізаваць сацыялістычную ўзаемадапамогу адстаючым.

Зараз «агульнае» кіраўніцтва ўборкаю ў саўгасах і калгасах не падыходзіць. Зараз нельга абмяжоўвацца адной агульнай дырэктывай для ўсіх саўгасаў і калгасаў.

Калі мы хочам, каб барацьба са стратамі ў часе ўборкі сапраўды дала адпаведныя вынікі, трэба наладзіць канкрэтнае жывое кіраўніцтва з уліка ўсіх асаблівасьцяй кожнага раёну, калгасу і саўгасу. Трэба лавіраваць, каб ва ўмовах кожнага раёну найлепш развязаць вузел летніх і асенніх сельска-гаспадарчых работ.

Райком забыў пра сваю пастанову

Глускі РК КП(б)Б 21 чэрвеня вынес пастанову аб падрыхтоўцы да ўборачнай, у якой паказвае на неабходнасьць правядзеньня масавай работы па арганізацыі працы ў калгасах, давядзеньня вытворчых заданьняў і г. д.

Пастанова гэта засталася толькі голай дэкларацыяй, бо на другі-ж дзень райком пра яе забыў. 24 чэрвеня ў калгасы і сельсаветы накіроўваўся раённы актыў. На інструкцыйнай нарадзе гаварылі аб чым хочаце, але не аб поліве і сенаўборцы.

Толькі 28 чэрвеня райза накіравала у сельсаветы пляны сенаўборкі. Сельсаветы іх атрымаюць у пачатку ліпеня. Між тым райза патрабуе да 10 ліпеня закончыць першы ўкос. А трэба скасіць 50 тыс. з лішкам га. Калі пачынаць уборку, райза «из скромности» зусім не ўпамінае.

Райкалгассаюз, даслаўшы пляны ўборачнай калгасам, у галіне арганізацыі працы раіць ім прачытаць газэту «Калгаснік Беларусі» за 8 чэрвеня. У гэтым заключаецца ўся практычная дапамога райкалгассаюзу калгасам. Пра арганізацыю ясляй і грамадзкага харчаваньня райкалгассаюз ніякіх указаньняў калгасам ня даў. Пра гэта проста забылі. С.

Гароды зарастаюць зельлем

План поліва выкананы на 26 проц.

Даць пралетарскім цэнтрам БССР 71 тыс. тон гароднінны — баявая задача прыгарадных гаспадарак.

Поліва зьяўляецца адказьнейшым этапам у барацьбе за гароднину. Ход поліва на 25-га чэрвеня паказвае, што каапгасы з гэтай задачай спраўляюцца зусім нездавальняюча. На працягу чэрвеня трэба было прапалоць, успушчыць 17 тыс. га. План поліва і пульхненьня выканан толькі на 26 проц. Асабліва адстаюць віцебскія гаспадаркі, якія толькі зараз прыступаюць да поліва. На барысаўскай фэрме 6 га буракоў зусім зарасьлі зельлем. Ня лепш і ў Менскіх прыгарадных гаспадарках. У каапгасе «Вольная праца» плян поліва і пульхненьня на 25 чэрвеня выканан на 18

КПП І КПЗБ АРГАНІЗУЮЦЬ АДПОР ФАШЫСТАМ, ЯКІЯ РЫХТУЮЦЬ ІНТЭРВЭНЦЫЮ СУПРОЦЬ СССР

Пралетарыят Польшчы перакрэсьліць пляны імпэрыялістаў

Пепарыўны ланцуг антысавецкіх правакацый сьведчыць аб тым, што сьветны імпэрыялізм імкнецца любой цаной уцягнуць СССР у вайну. Асабліва наглы характар носяць правакацыйныя выступленьні прадстаўнікоў японскага імпэрыялізму і прадажнай буржуазнай французкай прэсы. Японскі генштаб вуснамі розных Камаіці адкрыта заяўляе, што яму патрэбна савецкая Сібір, Савецкае Прымор'е.

Аб імкненьнях французкага імпэрыялізму справакаваць вайну з СССР і прыхоўваецца шмат гаварыць. Варта толькі прыпомніць правакацыйнае каментыраванне Тард'е з прычыны забойства белабандытам Гаргулавым прэзыдэнта Дюмэра, а таксама антысавецкую кампанію ў сувязі з пажарам на параходзе «Жорж Філіпар».

З асаблівым нецярпеньнем чакае пачатку з Далёкага Ўсходу ад свайго саюзьніка — японскага імпэрыялізму — ваенная зграя фашысцкай Польшчы. Прадажныя пісакі польскага фашызму са скуры лезуць, каб даказаць вайну японскаму саюзьніку сваю падрыхтаванасьць да вайны і прымусіць яго хутчэй выступіць супроць непераможнага Савецкага саюзу.

Цяперашняя міжнародная сітуацыя яшчэ менш напружаная, чым яна была напярэдадні сусьветнай вайны 1914 году. Гэтага ня скрывае нават і сама буржуазная прэса. Асноўная супярэчнасьць нашага часу — супярэчнасьць паміж капіталістычным сьветам і СССР, а таксама супярэчнасьці паміж асобнымі капіталістычнымі дзяржавамі абвастрыліся як ніколі дагэтуль.

За жэнэўскай дымавой заслонай, пайстраваць якую зьехаліся лепшыя «сяцэы» буржуазіі па падрыхтоўцы і правакаваньні вайны, за гэтай заслонай ліхаманкавымі тэмпамі праводзяцца падрыхтаваньні да новай сусьветнай бойні, да ўзброенага нападу на СССР.

Генштабы яшчэ раз правяраюць свае пляны, прабуюць эфэктыўнасьць новейшых атрутных газаў. Вайсковыя заводы працуюць па 24 гадзіны ў суткі, фабрыкуючы ў масавым маштабе ваенныя матар'ялы.

Але побач з гэтым растуць сілы на другім канцавосьці. Савецкі саюз, які высьпіцца сьветазарным маяком на фоне развалу капіталістычнай сыстэмы, рыхтуе да сябе сэрцы працоўных усіх краін і народаў. Пралетарыят Савецкай краіны, пад кіраўніцтвам ленінскай катэгорыі бальшавікоў, нябывалымі ў гісторыі тэмпамі будуе сацыялізм.

СССР вайны ня хоча. Гэта ведаюць працоўныя ўсяго сьвету і гатовы стаць рудзьмі на абарону сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Пралетарыят Заходу пільна прыглядаецца да таго, што робіцца на Далёкім Усходзе. У адказ на правакацыі японскага імпэрыялізму, па гарадох Заходняй Эўропы пракацілася гнеўная хваля дэманстрацый пратэсту. Камуністычныя партыі разгарнулі энэргічную антываенную кампанію, мабілізуючы на абарону СССР мільённыя масы рабочых і сялян.

Сярод камуністычных партый Заходняй Эўропы адна з начэльнейшых і адказьнейшых пазыцый прыпала **камуністычнай партыі Польшчы і аднаму з яе атрадаў — КПЗБ.**

Польшча — агрэсыўнейшы з васалаў французкага імпэрыялізму. Заходняя Украіна і Заходняя Беларусь — гэта брамы, праз якія Пілсудскі думае кінуць свае арміі на Кіеў і Менск, на краіну Саветаў.

Адказнасьць вучастку ставіць перад нашымі польскімі і заходня-беларускімі таварышамі вялізарнейшыя задачы. На іх выкананьне пераключылася ўся КПП. Ня было ніводнай буйнейшай падзеі на Далёкім Усходзе, якая ня была-б адзначана адпаведнай адозвай кампартыі.

У адозвах, на шматлікіх масоўках і мітынгах кампартыя выкрывае пляны польскіх імпэрыялістаў, паказваючы на сувязь, якая існуе паміж парафінаваньнем польска-савецкага пакту аб ненападзе і паміж арганізацыяй польскіх дыплёматамі тэрарыстычных актаў на тэрыторыі СССР, актаў накіраваных на падарваньне міжнароднага становішча Савецкага саюзу, на правакаваньне вайны.

Пры гэтым КПП і КПЗБ з усёй бальшавіцкай рашучасьцю змагаюцца супроць кампанейшчыны ў пытаньнях антываеннай работы. Барацьба за мабілізацыю мас на абарону СССР пастаўлена ў цэнтры ўвагі партыі. Гэтым прасякнута кожнае яе выступленьне.

Барацьба супроць уласнай буржуазіі за польскі Кастрычнік, барацьба за мір, — гэта барацьба за непарушнасьць савецкіх граніц — так ставіць пытаньне кампартыя, **бязьлітасна дэмаскуючы ППС, якая пад фігавым лістком пацыфісцкіх фраз, прымае самы актыўны ўдзел у падрыхтоўцы антысавецкіх авантур.**

КПЗБ у сваёй штодзённай працы выкрывае манэўры беларускіх нац.-фашыстаў, яна выкрыла манэўр беларускіх хадэкаў (хрысьціянскіх дэмакратаў), якія пад напорам радыкалізацыі мас былі прымушаны ў рэвалюцыях свайго апошняга зьезду выказацца супроць падрыхтоўкі вайны. У авечай скуры «ворагаў вайны» хадэкі — сустрэчная частка лягеру беларускага нацыянал-фашызму — будуць і надалей праводзіць сваю палітыку падтрыманьня інтэрвэнцыяністкіх ідэй пілсудчыны.

Масавая антываенная работа, якую КПП і КПЗБ наперакор абвостранаму тэрору пасьпяхова праводзяць, — дае свае рэзультаты. Масы актыўна выступаюць пад кіраўніцтвам партыі і камсамолу супроць канкрэтных праяўленьняў ваеннай падрыхтоўкі польскага фашызму. Сяляне Заходняй Беларусі байкатуюць шарваркі — прымусовую працу на пабудове стратэгічных шляхоў ваеннага прызначэньня.

Ва многіх чяслох зьлёты банд Балаховіча былі разгромлены самімі рабочымі.

Усё часьцей здараюцца выпадкі братаньня салдат з дэманструючымі рабочымі і сялянамі, рашучы пераход іх на бок апошніх, сумесная барацьба супроць паліцыі.

Узрастаючыя сымпатыі шырокіх народных мас да СССР кампартыя накіроўвае ў рэчышча штодзённай барацьбы за мір, у абарону Савецкага саюзу. Калі-б польскія імпэрыялісты задумалі ажыцьцявіць свой плян паходу на Кіеў і Менск, яны натыкнуцца на салідарны фронт абаронцаў сацыялістычнай бацькаўшчыны **ўнутры** сваёй дзяржавы.

Пралетарыят перакрэсьліць пляны генштабаў інтэрвэнцыі.

ПРАЦОЎНЫЯ ПОЛЬШЧЫ НЯ ХОЧУЦЬ ВАЯВАЦЬ ЗА ПОЛЬШЧУ „АД МОРА ДА МОРА“

Вось некалькі штрыхоў з барацьбы рабочых Польшчы супроць ваеннай небясьпекі і інтэрвэнцыі.

Рабочыя **ваеннай прамысловасьці,** перамагаючы ўсе перашкоды, становяцца на шлях барацьбы супроць капіталістычнага наступленьня, **ведаючы, што барацьба супроць «сваёй» буржуазіі ёсьць лепшай абаронай СССР.**

Так, на дзяржаўным **авіяцыйным** заводзе ў **Бела-Падляскай** рабочыя сыстэматычна на працягу трох месяцаў выплачвалі толькі **50 проц.** фактычнай зарплаты. Рабочыя сталярнага цэху пастанавілі баставаць. Выбралі на мітынгу забастовачны камітэт і абвясьцілі італьянскую забастоўку. **6 дзён упартай барацьбы закончыліся перамогай рабочых.**

Кампартыя Польшчы правяла ў канцы сакавіка **антываенны тыдзень.** Ня гледзячы па надзвычай цяжкія ўмовы, на нябачаны разгул белага тэрору, у Варшаве былі скліканы і праведзены баявыя сходы на буйнейшых **мэталюргічных заводах,**—дзьве масоўкі па заводзе **ГЭРЛЯХА,** па адной—на заводзе **«ПОЦІСК», у чыгуначных майстэрнях, ля фабрыкі «ПАРАВОЗ» і «ФРАНАШЭК».** На гэтых масоўках прысутнічала каля **8.000** рабочых.

У красавіку **тысячы рабочых Варшавы** дэманстравалі каля саду Красінскага **супроць наступленьня капіталу на жыцьцёвы ўзровень працоўных, супроць падрыхтоўкі паходу на СССР.** Паліцэйскія з асаблівым смакам і энэргіяй акладалі дубінкамі антываенных дэманстрантаў, разганяючы іх.

У гэты-ж час адбыліся **антываенныя** дэманстрацыі на цагельнях і кахляных заводах у **Берасьці.** Рабочыя, якія яшчэ працуюць, сумесна з беспрацоўнымі, наперакор паліцэйскаму тэрору **выйшлі на вуліцу з чырвоным сьцягам.**

Пралетарыят і працоўныя Польшчы ня хочуць ваяваць, ня хочуць праліваць сваю кроў у інтарэсах буржуазіі, за Польшчу «ад мора да мора».

Японскія генштабісты аглядаюць вайсковыя казармы ў Варшаве

НОВЫЯ ХМАРЫ АСАДНІКАЎ

У той час, як мільёны сялян Заходняй Беларусі гібеюць ад безьзямельля і голаду, фашысцкім урадам ухвалены новы закон, які ў значнай мэры павялічвае асадніцтва на акупаваных беларускіх і украінскіх землях.

Паводле гэтага закону зямлёй будуць надзяляцца члены вайсковых і паўвайсковых арганізацый, накшталт **«Пішыспособення вайсковаго», «Стральца»** і інш. Новая хваля былых афіцэраў, розных шпікоў і дэфэнзыўчыкаў нахлыне на Заходнюю Беларусь, забіраючы лепшыя кавалкі зямлі.

Урад фашысцкай дыктатуры, рыхтуючыся да новай вайны супроць СССР, сьцягвае на «крэсы» новыя хмары асаднікаў, каб акупацкім ботам прыдушыць нацыянальна-вызваленчую барацьбу рабочых і сялян, каб стварыць на прасторах Заходняй Беларусі цішыню могілак, так неабходную польскай імпэрыялістычнай буржуазіі для ажыцьцяўленьня ідэй «экспансіі на Ўсход».

445.000 — блізка паўмільёна асаднікаў нагнаў фашысцкі ўрад з Польшчы на Заходнюю Беларусь за дзесяць год акупацыі! Ужо сама гэта лічба гаворыць красамоўна аб плянах польскай буржуазіі. Асаднікі — праваднікі паленізацыі акупаванай краіны, верная і надзейная апора фашызму.

Нічога дзіўнага, што сваіх агентаў урад акружае пашанай, прыпадносячы ім усё новыя і новыя падарункі. Ухвалены закон зьнімае з асаднікаў усю запазычанасьць, забясьпечвае ім вялікія крэдыты, дае цэлы рад іншых ільгот і прывілей. Адначасова акупанты ўзвальваюць на плечы працоўных Заходняй Беларусі новыя падатковыя цяжары.

Беларускія нацыянал-фашысты, якія прыпідваюцца абаронцамі беларускага народу, нават не заікнуцца супроць акупанта і насаджэньня асадніцтва. А фашысцкая **«Беларуская крыніца»** дык проста плача, што ўраду дорага будуць каштаваць асаднікі, а таму ня варта так старанна іх «сеяць»:

«Польскае вайсковае асадніцтва на нашых землях не дасягае сваёй мэты і зьяўляецца вельмі дарагім для дзяржавы.

... Без пастаяннай дапамогі яно зусім ня жыцьцяздольнае».

Чорныя груганы з **«Крыніцы»,** як бачыце, клапоцяцца не аб інтарэсах працоўных мас Зах. Беларусі, якія стогнуць у падвойным ярме сацыяльнай і нацыянальнай няволі. Хрысьціянскія дэмакраты з «Беларускай крыніцы» клапоцяцца і хварэюць за інтарэсы польскай дзяржавы, за інтарэсы акупантаў.

Аднак, не дапаможа польскаму фашызму браніяваны кулак — асаднік, ні шыбеніцы, ні здрадніцкая прадажная «прада» беларускіх нацыянал-фашыстаў. Рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі разам з працоўнымі ўсёй Польшчы агнём пралетарскай рэвалюцыі ачысьцяць шлях да сацыялізму, як гэта зрабілі рабочыя і сяляне Савецкага саюзу.

СУПРОЦЬ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНАЙ ВАЙНЫ, У АБАРОНУ СССР

(З рэзалюцыі ЦК КПП)

Шуканьне польскай буржуазіяй выхаду з крызісу сёньня больш, чым калі-небудзь узмацняе яе **АНТЫСАВЕЦКІЯ, ІНТЭРВЭНЦЫЯНІСЦКІЯ ІМКНЕНЬНІ,** прычым фронт падрыхтоўкі да вайны непарыўна перапляцаецца з унутраным фронтам контр-рэвалюцыі. Ваенныя падзеі ў Манчжуры ўзмацнілі надзеі польскіх інтэрвэнцыяністаў, рост антысавецкай ваеннай базы на Далёкім Усходзе шчыльна зьвязан з яе пашырэньнем у Польшчы, у Прыбальтыцкіх краінах, а таксама ў краінах Малой антанты. Вымушаныя мірнай палітыкай савецкага ўраду, вялізарнай папулярнасьцю СССР сярод працоўных мас Польшчы, варожымі іх адносінамі да контр-рэвалюцыйнай антысавецкай вайны — перагаворы аб ненападзе суправаджаліся сугуба агрэсыўнымі крокамі ўраду Пілсудскага як на міжнароднай, так і на ўнутранай арэне (узаемныя наведваньні шэф прадстаўнікоў штабаў армій польскай і румынскай, наведваньні югаслаўскага і румынскага міністраў замежных спраў Варшавы, канфэрэнцыя аграрных краін, гутаркі Залескага з французскім і ангельскім урадам па пытаньні павялічэньня польскіх узбраеньняў, узмоцненая актыўнасьць Балаховіча, стварэньне «украінскага мосту» — абяцаньне дапусьціць украінскую буржуазію да ўдзелу ў дзяржаўным апараце, мілітарызацыя польскіх чыгунак і г. д.).

Пакт аб ненападзе, да заключэньня якога фашызм быў прымушан пад націскам мірнай палітыкі СССР, вялізарнай сымпатыі працоўных мас Польшчы да Савецкага Саюзу і росту рэвалюцыйнага руху, польскі імпэрыялізм прабуе выкарыстаць у якасьці пацыфісцкай шыльды, каб утаіць узмоцненую падрыхтоўку да вайны. Фразы польскіх імпэрыялістаў аб маральным раззбраеньні маюць мэтай прыкрыць іх нябывалыя ўзбраеньні. Па меры таго, як японскія войскі прасоўваюцца наперад, усё больш яркa выступаюць разьлікі польскай буржуазіі на савецка-японскую вайну, якая павінна паслужыць пачаткам для інтэрвэнцыі супроць СССР.

Вузлавым пунктам задач партыі павінна быць пашырэньне фронту барацьбы супроць наступленьня капіталу, супроць фашысцкага тэрору, супроць імпэрыялістычнай вайны, за абарону СССР. Выходзячы з гэтага партыя павінна:

1) Даць неабходны размах антываеннай кампаніі, якая разгортваецца на падставе штодзённай барацьбы. Увага працоўных мас, іх пільнасьць і баявая гатоўнасьць павінны самым шчыльным чынам увязвацца з нападам імпэрыялістаў на Кітай, з пашырэньнем імпэрыялістамі антысавецкай ваеннай базы на Далёкім Усходзе. **Абарона СССР павінна быць непарыўна зьвязана з абаронай Кітаю, з абаронай кітайскай рэвалюцыі.** Мы павінны браць асноўны ўпор на абарону будаўніцтва сацыялізму, як вагара міжнароднай пралетарскай рэвалюцыі, перад правакацыйнымі намерамі імпэрыялістаў. З гэтай мэтай неабходна пастаянна папулярызаваць мірную палітыку Савецкага саюзу і зрываць пацыфісцкую шыльду з антысавецкіх ваенных падрыхтаваньняў польскага імпэрыялізму. Наглядным прыкладам гэтай шыльды павінна служыць новая раззбраенчая канфэрэнцыя. Неабходна дэмаскаваць адносіны фашыстаў і сацыял-фашыстаў да пакту аб ненападзе, ганьбіць паклёпніцкую кампанію ППС супроць Савецкага саюзу, яе хлусьню аб «чырвоным імпэрыялізме», аб савецкіх ваенных плянах на Далёкім Усходзе, — як, фактычную падрыхтоўку да інтэрвэнцыі. Адначасова неабходна выкараняць у першую чаргу ў радох партыі ўсялякія праваенныя настроі, усялякія разьлічваньні на наступленьне Чырвонай арміі, усялякія тэндэнцыі да заскокаў, якія льлюць ваду на млын ворага. Барацьбой супроць імпэрыялістычнай вайны, за абарону СССР павінна быць прасякнута ўся дзейнасьць партыі, кожная забастовачная барацьба, кожнае вулічнае выступленьне, кожная бойка беспрацоўных, працоўных жанчын і моладзі. Уся практычная арганізацыйная работа партыі павінна быць прыстасавана да ўмоў непасрэднай пагрозы нападу на СССР.

У гэтым становішчы асабліва важнай задачай становіцца **барацьба за армію. Сыстэматычная работа сярод** салдацкіх мас, сярод запасных і навабранцаў ня стала яшчэ баявой задачай усёй партыі. Неабходна, каб гэта работа зрабілася справай кожнай ячэйкі, як баявая задача дня. Неабходна мабілізацыя шырокіх мас пралетарыяту і сялянства для барацьбы за армію тым больш, што фашысцкі ўрад пачынае ўжо перакідваць ваенныя атрады на ўнутраны фронт, пачынае ўжываць іх для задушэньня забастовак і дэманстрацый.

Рэвалюцыйнае сялянства распраўляецца з прадстаўнікамі фашысцкай улады

ВАРШАВА. Рэвалюцыйныя выступленьні працоўных мас Зах. Беларусі і Зах. Украіны супроць улады акупантаў сталі настолькі звычайным зьявішчам, што паведамленьні аб іх зьяўляюцца неабходнай часткай штодзённай хронікі нават у самых добрапажаданых урадавых польскіх газэтах. Выступленьні сялян накіраваны ў роўнай меры як супроць сацыяльнага, так і супроць нацыянальнага ўціску, які практыкуецца пілсудчынай.

Згодна паведамленьня «Ілюстраванага кур'ера подзённага» ў вёсках Палесься—**Карпілаўцы, Каташно, Сошычнё, Майдане і Верхах,**—некалькі дзён назад ноччу былі разьвешаны вялікія транспаранты з надпісамі: **«ДАЛОЎ ПОЛЬСКІХ АКУПАНТАЎ! КРОЎ —ЗА КРОЎ» У в. Верхах** такі транспарант быў прымацован да крыжу на мясцовай царкве.

Згодна паведамленьня тэй-жа газэты, **у вёсцы Стэпары,** Майшагольскай воласьці, натоўп сялян, узброіўшыся каламі, рыдлёўкамі і сякерамі, выгнаў з вёскі агентаў зямляўпарадчых органаў. Інструктар па правядзеньні мэліярацыйных работ цяжка паранен. Асабліва абурэньне так званымі мэліярацыйнымі мерапрыемствамі на крэсах тлумачыцца тым, што ў сапраўднасьці яны зьяўляюцца адным з дадатковых мэтадаў умацаваньня польскай кулацка-капіталістычнай праслойкі на акупаваных украінска-беларускіх землях.

Асабліва паказальным для настрою працоўных мас на Зах. Беларусі і Зах. Украіне зьяўляецца выпадак, які меў месца 24 чэрвеня ва ўкраінскай вёсцы **Дольні Берагі,** Лісоўскага павету (Львоўскае ваяводзтва). Павятовыя ўлады разам з фашысцкімі «грамадзкімі арганізацыямі», па ініцыятыве **графа Патоцкага,** у пэўныя дні штогод наладжвалі... «сьвяты працы». У дзень «сьвята працы», установлены графам **сялян выганялі на бясплатныя работы па рамантаваньні мастоў, стратэгічных дарог, будынкаў урадавых устаноў і г. д.**

Калі ў папярэднія гады польскай фашысцкай адміністрацыі пагрозамі і штрафамі сяк-так удавалася прымусіць сялян «сьвяткаваць», дык у гэтым годзе справа прыняла зусім нечаканы зварот. Прадстаўнік павятовай улады **Зэмба,** які парашыў выехаць у вёску для «падрыхтоўкі сьвята» да прыезду графа Патоцкага, быў сустрэчан сялянамі ў літаральным сэнсе гэтага слова каламі. Як апісвае «Ілюстраваны кур'ер подзённы», каля 200 сялян, узброеных косамі, сякерамі, матыгамі і каламі, скамандавалі пану Зэмбе «рукі ўверх» і прапусьцілі яго скрозь доўгі строй, зьбіваючы палкамі.

«Хваляваньне ў вёсцы набыло нязвычайна пагражаючыя разьмеры»— адзначае газэта. Сяляне прагналі старосту і адабралі казённыя пячаткі. Графу Патоцкаму прышлося адмовіцца ад рызыкоўнага намеру, прысутнічаць на «сьвяце працы».

Прыбыўшая паліцыя, паводле ўказаньня членаў мясцовай арганізацыі польскага фашысцкага саюзу «Стшэлец», у якасьці галоўных вінаватых бунту **арыштавала 36 сялян.** Сярод арыштаваных—некалькі **60-гадовых старых, а таксама дзяцей і падростаў. Хаваючыся ад паліцыі, група сялян уцякла ў горы.**

Бурныя дэманстрацыі пратэсту ў Польшчы

ВАРШАВА, 2. 1 ліпеня ў сувязі з «днём барацьбы з голадам», які праводзіцца польскай кампартыяй, адбыўся **ў Варшаве** рад дэманстрацый. У часе разгону дэманстрацый некалькі чалавек было моцна зьбіта паліцыяй, 6 чал. арыштавана. На працягу ўсяго дня гарадзкія сады былі закрыты. Па ўсяму гораду разьяжджалі моцныя паліцэйскія патрулі.

Вялікая дэманстрацыя адбылася так сама **ў Лодзі.** На мітынгу выступаў камдэпутат тав. **Розэнберг.** Калі паліцыя прабавала разагнаць дэманстрантаў, з натоўпу пасыпаліся каменьні, якімі быў ранен адзін паліцэйскі.

У Катовіцах (Верхняя Сілезія) і **ў Сасноўцу** (Дамброўскі раён) групы рабочых у розных пунктах стараліся арганізаваць дэманстрацыі, але былі расьсеяны паліцыяй.

Забойства камандзіра разьдзелу салдатамі

ВАРШАВА. У Сувалках (Заходняя Беларусь) групаю салдат быў забіт гэтымі днямі камандзір разьдзелу трэцяга кавалерыйскага палка **Янчэўскі.** «Ілюстраваны кур'ер подзённы» тлумачыць факт забойства тым, што быццам салдаты «былі п'яныя». Ваенныя ўлады праводзяць арышты і сьледзтва для высьвятленьня прычын забойства.

80 ангельскіх бомбавозаў для Эстоніі

ЛЕНДАН, 30-VI. (ТАСС). «Дэйлі Уоркер» паведамляе, што ангельская авіяцыйная кампанія «Гоўкэр» выканала заказ эстонскага ўраду на 80 аэраплянаў-бомбавозаў. Перадаюць, што гэтыя аэрапляны могуць разьвіваць хуткасьць у 240 міль у гадзіну.

СЛОВЫ І СПРАВЫ ПЯЎЦОЎ „МАРАЛЬНАГА РАЗЗБРАЕНЬНЯ“

Вострасьць гаспадарчага крызісу ў Польшчы, уздым рэвалюцыйнага руху, які б'е ў фундамант капіталістычнага ладу, усё больш штурхае фашысцкую дыктатуру шукаць выхаду ў імпэрыялістычнай контр-рэвалюцыйнай вайне супроць СССР.

Польскія імпэрыялісты марыць аб Польшчы ў границах 72-га году, г. зн. аб захваце Савецкай Украіны, Савецкай Беларусі, адабраць у рабочых фабрыкі і заводы і вярнуць іх капіталістам, а зямлю адабраць у сялян і вярнуць памешчыкам.

У гэтым напрамку ідуць зараз усе падрыхтаваньні польскага імпэрыялізму. Мэце інтэрвэнцыі падпраўдавана ўся міжнародная і ўнутраная палітыка польскага фашызму. Узбраеньні з кожным годам растуць. У той час, калі прамысловасьць і ўсё гаспадарчае жыцьцё Польшчы задыхаецца ў цісках крызісу, які ўсё больш абвастраецца, толькі адзіная прамысловасьць—**ваенная—не адчувае ніякага крызісу.** Гэта прамысловасьць налічвае **30 дзяржаўных і 100 прыватных фабрык.** З кожным годам расьце база вайны, растуць склады амуніцыі і зброі. На вайсковыя патрэбы ў 1929-30 г. выдаткавана **836,6 млн. злотых,** а ўжо ў 1931-32 г. выдаткоўваецца **847 млн. злотых.** Гэтыя афіцыяльныя даныя значна перапачэньшаны. Сюды ня ўключаны сакрэтныя фонды на ўзбраеньні, якія ёсьць ва ўсіх міністэрствах. Калі да гэтага яшчэ дадаць сродкі, якія Польшча атрымлівае ад міжнароднага імпэрыялізму ў выглядзе пазык, дык нам прадставіцца ўвесь малюнак, якімі тэмпамі ўзбройваецца наш сусед.

Французкі імпэрыялізм крымае асаблівы акцыўны ўдзел ва ўзбраеньнях Польшчы. Францыя дала для Польшчы ў 1929-31 г. дзьве пазыкі ў суме 675 млн. франкаў. Пры дапамозе французскіх капіталаў у апошнія гады пабудавана ў Польшчы **33 новыя ваенныя заводы,** у тым ліку **4 артылерыйскіх, 2 для вырабу выбуховых матэрый, 2 заводы зброі, 4 амуніцыйныя, 3 ваенныя авіяцыі і 1 танкавы.** Афіцыяльна на ваенных фабрыках працуе **65 тыс. рабочых.**

Калі прагледзець, як разьмяркоўваецца ваенны бюджэт 1931-1932 г., дык убачым, што на сухаземную армію выдаецца **735.313.493 злотых,** на ваенна-морскі флёт—**34.280.000** і на паветраны флёт—**78.006.507 злотых.**

Вось, як выглядае сапраўднае аблічча польскіх «пацыфістаў»—пяўцоў «маральнага раззбраеньня».

Выходзячы рэальна са сваіх капіталістычных абставін, адкрыта пафашысцку польскія пісакі заяўляюць аб неабходнасьці вайны для Польшчы:

«Хутчэй-бы разагрэць халадзеючыя руні ля ваеннага вогнішча» («Ілюстраваны кур'ер подзённы»).

І не дарма польскія фашысцкія ўдарныя адзелы гэтымі днямі апублікавалі новую імпэрыялістычную карту ў межах 1772 году, якая зьяўляецца для іх сродкам па падрыхтоўцы грамадзкай думкі да вайны. Вельмі характэрна аб гэтых антысавецкіх гра бежніцкіх плянах польскага імпэрыялізму расказвае генэрал Геньнікг-Міхаэліс у артыкуле «Абарона ўсходніх границ». Ён кажа:

«Усходнія граніцы Польшчы былі вызначаны мірным дагаворам з бальшавікамі ў Рызе. Вызначэньне граніц, якія адпавядалі палітычным, гістарычным, стратэгічным, эканамічным і культурным інтарэсам Польшчы—было заданьнем надзвычай цяжкім. На першы погляд здавалася-б, што трэба імкнуцца да гістарычнага рубяжу, акрэсьліваючы плянай да Дняпра аж—па Кіеў, да старых дзіких палёў. Гэта дыктавала наша вялікае мінулае, зросшае шматлікімі вузламі з Украінай і Беларусьсю, прасіла гэтага польская культура, прышчаплёная вякамі на гэтых землях, дамагаліся гэтага нашы эканамічныя інтарэсы».

Далей гэты генэрал, марачы аб Польшчы «ад мора да мора», зусім адкрыта гаворыць, што Рыскі трактат трэба ануляваць, бо ён зьяўляецца кампрамісам, бо, заключыўшы дагавор у Рызе, «Польшча прыняла, такім чынам, кампрамісную границу, яна пакінула бальшавіком так дарагі для яе Камянец-Падольск, важную з пункту гледжаньня стратэгічна-прыфрантовую чыгунку Камянец-Шапятоўку, славутую Тураўскую пушчу, а па акраінах ляжаць вялікія поласы земляў, якія належаць палякам» (чыт. абшарнікам).

Акупацыя японскім імпэрыялізмам Манчжурыі распаліла апэтыты польскіх імпэрыялістаў. Уся буржуазная прэса Польшчы горача вітае зброю Японіі. Буржуазія пачынае заклікаць японскіх акупантаў не абмяжоўвацца толькі Манчжуриай, а выконваць найхутчэй свой плян захопу Сібіры, ударыць з Усходу, бо

«Лосьць толькі глянуць на карту, каб пераканацца, чым зьяўляецца для сённяшняй Расіі Ўладывасток. Ёсьць гэта толькі адзін выгодны саецкі порт на адкрытым моры. У выпадку, калі адрэзець шлях у Ціхі акіян—для Расіі застаецца замярзаючы Ленінград на закрытым Бальтыйскім моры і парты яшчэ больш закрытых Чорнага і Азоўскага моры, ды, нарэшце, закрыты пёрам большую частку году Беламорскі Архангельск. Адмак-жа ў цяперашнім становішчы рачэў дарога да Ціхага акіяну адзана на паску, а сапраўды ня «паску» Японіі. («Газэта польска», 28-1—1932 г.).

Як бачым, польскія буржуі і памешчыкі хацелі-б хутчэй імпэрыялістычную вайну на Ўсходзе супроць кітайскага народу ператварыць і ў вайну супроць СССР. Для гэтага польскі генэральны штаб усё больш шчыльней супрацоўнічае з японскім і французскім генштабамі.

Імпэрыялістычны польска-японскі саюз накіроўвае супроць Савецкага саюзу. «Чырвоны сьцяг» — орган КПЗБ адносна гэтага ваеннага саюзу піша пастуупнае:

«Надаўна ў Варшаве японскі праф. Е-Пін-Ара ў адным з сваіх выступленьняў заявіў, што паміж Польшчай і Японіяй існуе дагавор, згодна якога ПОЛЬШЧА ПАБІННА ВЫСТУПІЦЬ СУПРОЦЬ СССР У ВЫПАДКУ ЯПОНА-САВЕЦКАЙ ВАЙНЫ. ЗРАЗУМЕЛА, ШТО ГЭТА НЕ ВЫКЛЮЧАЕ, ШТО ПОЛЬШЧА МОЖА Ў ЛЮБЫ МОМАНТ ПЕРШАЯ НАПАСЬЦІ НА САВЕЦКІ САЮЗ». («Чырвоны сьцяг» № 3, 1932 г.).

Факт існаваньня польска-японскага ваеннага саюзу пацьвярджаецца супрацоўніцтвам паміж імі на міжнароднай арэне. На апошнім пасяджэньні Лігі нацый, на якім разглядалася пытаньне пацыфікацыі Заходняй Украіны, дзе польскі фашызм агнём і мячом таксама расчышчае плядцарм вайны, абарону гэтых крывавых дзеяньняў узяў на сябе японскі імпэрыялізм. Японскі дэлегат Сато з паглым цынізмам даказваў, што Польшча зрабіла зусім правільна, калі паслала карныя экспэдыцыі, якія зьнішчылі полныя украінскія вёскі, барбарскі катавалі і забівалі працоўных, якія не хацелі падпарадкавацца імпэрыялістычным мэтам і змагаліся за вызваленьне з-пад акупацыі. Таму так горача вітала фашысцкая прэса японскіх імпэрыялістаў у Лізе нацый.

Для канкрэтнай дапамогі японскім акупантам у Манчжурыі, зусім адкрыта праз Гдыню выехала ўжо больш як 200 адборных белагвардзейцаў на Ўсход. Але ня толькі для Ўсходу патрэбны польскаму імпэрыялізму недабіткі белагвардзейцаў. З гэтых бандытаў ва ўсіх кутках Польшчы арганізуюцца атрады Балаховіча. З асяродзішча іх за грошы дэфэнзывы і генштабу адкамплёўваюцца Кавэрды, Вайцэхоўскія, Палянскія і г. д. Калі агент генштабу Любарскі камандаваў Штэрнам і Васільлевым, накіроўваючы дула рэвальвэру на нямецкага пасла ў Маскве, дык фашысцкае «Слова» адкрыта пісала:

«Добрая сітуацыя Польшчы бязумоўна зьяўляецца залежнай ад разрыву адносін паміж Бэрлінам і Масквой. Так было заўсёды, так ёсьць і зараз» (Віленскае «Слова» 22-IV 1932 г.).

У сувязі з сітуацыяй у Нямеччыне, калі нямецкія капіталісты прасоўваюць да ўлады Гітлера, у польскіх падпалычыкаў антысавецкай вайны ўсё больш пачынаюць праяўляцца надзеі на адзіны супольны фронт Францыі, Нямеччыны і Польшчы.

«Польска-нямецкая згода стварыла-б у Эўропе сілу, з якой кожны павінен быў-бы лічыцца. Мы маем найбольшую пасьля французкай армію ў Эўропе. Нямеччына мае наймагутнейшую ваенную сілу. Наш саюз з Францыяй дапамагае нам у Імкненьні стварыць сярэдня-эўрапэйскую трохдзяржаўную згоду, задачай якой будзе адначасова: мір у Эўропе і абарона Эўропы».

На пляцформе гэтага антысавецкага блёку-трыкутніку зыходзяцца ўсе палітычныя групоўкі фашысцкай Польшчы, пачынаючы ад пілсудчыкаў, народных дэмакратаў і да сацыял-фашыстаў уключна.

Польскія акупанты агнём і мячом, палявымі судамі, лесам шыбеніц, прымусовым высяленьнем рэвалюцыйных рабочых і сялян, разтромам нацыянальна-вызваленчых арганізацый, нацыянальным уціскам і палёнізацыяй рыхтуюць сабе плядцарм будучай вайны супроць СССР.

На гэтых землях шпаркім тэмпам будуюцца стратэгічныя пункты і ваенныя базы будучай вайны. У 1932 г. будуюцца аэрадромы ў мясцовасьцях: **Беласток, Сувалкі, Ломжа, Астраленка і Бельск.** Ужо заканчваецца пабудова аэрадрому ў Горадні, каля Слоніму і г. д. У Астраленцы новы аэрадром будуецца пры маёнтку Прытулы, у Сувалках каля Зялёных Камадульскіх, у Бельску каля в. Стулівоца і г. д. У Вільні будуецца завод па вырабу ваенна-вучэбных самалётаў. Гэта ў той час, калі ўсё гаспадарчае жыцьцё Заходняй Беларусі, усе галіны прамысловасьці заняпадаюць і руйнуюцца.

Асабліва на Зах. Беларусі разгортваецца пабудова стратэгічнай сеткі шасэйных і грунтавых дарог, а таксама і чыгунак. На Віленшчыне, калі некалькі год таму назад на ўсе 4 тыс. клм. дарог было толькі 350 клм. шасэйных, дык зараз іх ужо 1500 клм. Пабудавана новая шасэйная дарога Вільня-Глыбокае - Дзісна даўжыней 300 клм. Распачаты працы па пабудове дарог і мастоў у Віленска-Троцкім павеце. Рыхтуюцца работы па ўстаноўцы 6 вялікіх жалезных мастоў каля Бярэсьця праз р. Мухавец, у Роўным на р. Усьці і г. д. На працягу Івацэйчы-Тэлеханы ў Віленскай чыгуначнай дырэкцыі вузка-калейка пераведзена ўжо на звычайную чыгуначную лінію. Наколькі шпаркім тэмпам ідзе падрыхтоўка інтэрвэнцыі, сьведчыць той факт, што ўжо ўсе чыгуначныя важнейшыя варштаты пераносяцца з тэрыторыі Зах. Беларусі бліжэй у цэнтр Польшчы. Так, напрыклад, Пова-Вілейскія і Віленскія варштаты перанесены ў г. Лапы.

Усё гэта знаходзіць сваё тлумачэньне ў самых плянах польскага імпэрыялізму, **у палягчэньні манэўраздольнасьці польскай арміі.**

Для ваенных мэтаў, для ўзмацненьня акупацыі зараз праводзіцца новае насаджэньне асадніцтва на землях Зах. Беларусі. 17-II—31 г. фашысцкі сойм прыняў спэцыяльны закон аб дадатковым надзяленьні зямлёй ваенных калёністаў. Гэтыя землі будуць заграблены ад беларускіх працоўных сялян у разьмеры 212.000 га. Фашысцкі ўрад садзіць калёністаў не абыкавых, а больш надзейных і выпрабаваных у клясавай барацьбе за інтарэсы капіталістаў і абшарнікаў. Нагыхлад, з ліку 3423 асаднікаў з розьнымі адзнакамі за актыўную барацьбу з бальшавікамі

Агляд друку

НАМЁК КАЛГАСЬНІКАЎ ПА АДРАСЕ РЭДАКЦЫІ

(„Калгасная праўда", Гарадок; „Калгасьнік Беларусі")

Гарадоцкія каапэратары свядамі зразумелі ролю спажаўсыстэмы ў разгортваньні калгаснага гандлю.

Апынуўшыся перад фактам, што калгасьнікі і працоўныя адпаасобнікі з кожным днём усё больш і больш вынозяць прадуктаў на рынак, каапэратары парашылі, што ім нельга стаяць у баку, што пара неяк вызначыць свае адносіны да рынку.

І вызначылі. Выкінулі пазначную колькасьць прамтавараў на рынак і пачалі прадаваць іх па каапэрацыйных кніжках і пасьведчаньнях. Мала гэтага. «Лявацкія» элемэнты, аматары мэхалічна разьмяркоўваць, пашлі па лініі «ўдасканаленьня тэхнікі» рэалізацыі тавараў на рынку. Пастаўлена ўмова: хто жадае купіць тавар, калі ласка, унясі суму грошай роўную 50 проц. кошту купленага тавару, у мэтавы ўзнос і дапоўні пай. Інакш ні на капейку...

Гэта першы варыянт «гандлю». Другі «варыянт»—тавараабмен проста і стопроцантны.

Як рэагаваў на гэту агідную «лявацкую» практыку райком КП(б)Б? Як адносьлася да ўсіх гэтых фактаў раённая газэта?

«Калгасная праўда» ў нумары ад 13 чэрвеня зьмясьціла пастанову Гарадоцкага РК КП(б)Б і тут-жа «дадатковыя мерапрыемствы» па разгортваньні калгаснага гандлю.

У першым-жа пункце «дадатковых мерапрыемстваў» райком прапануе райспабу:

> «Забараніць у базарныя дні каапэрацыі, ЗВК і ЗРК на рынку рабіць куплю прадуктаў сельскай гаспадарчы ў абмен на прамтаварыі».

А не ў базарныя дні?

Паводле пастановы выходзіць так, што не ў базарныя дні тавараабменныя каапэрацыі дазваляюцца.

Цяжка сказаць, якой думкі наконт тавараабмену і другіх грубых скажэньняў прыйшоўшы савецкага гандлю пры трымліваецца рэдакцыя «Калгаснай праўды».

Свае адносіны да калгаснага гандлю газэта вызначыла некалькі інакш, чым каапэрацыя. Калі адкінуць факт зьмяшчэньня пастановы райкому з блытаным пунктам, дык ні ў якіх памылках або недакладнасьцях газэту на чале з яе рэдактарам Зайцавым упікнуць нельга.

Справа чыстая. І да таго чыстая, што **амаль ніводнага слова,** апрача пастановы, аб калгасным гандлі.

Праўда (прыходзіцца агаварыцца) «адно слова» пра калгасны гандаль ёсьць.

20 чэрвеня (заўважце) зьмешчан артыкул аб значэньні сталінскага паходу. Самога паходу газэта не разгарнула. Ня будзем шукаць прычын, чаму імянна 20 чэрвеня «Калгасная праўда» загаварыла аб сталінскім паходзе, а ня месяц таму назад—прыкладна 20 мая. Пакінем гэта на сумленьні рэдакцыі.

Што-ж усё такі гаворыцца ў пакаланым артыкуле?

> **«Выключную ролю ў папаўненьні рабочага снабжэньня адыгрывае калгасны гандаль, як неадлучная частка савецкага гандлю».**

Гэта зусім правільна, але ня поўна. Нельга ставіць крошку, не сказаўшы аб вялізарным значэньні разгортваньня гандлю с.-г. прадуктамі ў справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, узьдыму таварнасьці гаспадаркі і паляпшэньня дабрабыту самых калгасьнікаў.

У артыкуле аб сталінскім паходзе, як і ва ўсім камплексе газэты (з 1 мая да 20 чэрвеня ўключна), ні слова аб мясцовым гарадоцкім рынку, ні слова аб ларкох, магазынах, аб прамтаварах, аб папулярызацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду.

Грубыя скажэньні прыцыпаў савецкага гандлю, дапушчаныя гарадоцкімі каапэратарамі, **нежаданьне** спажывецкай і прамысловай сыстэмы выступіць у ролі арганізатараў культурнага гандлю на савецкім рынку і, нарэшце, упартае **маўчаньне** раённай газэты—гэта **зьвяньні аднаго ланцуга «лявацкага» супраціўленьня разгортваньню калгаснага гандлю.**

Чым паўней гэта будзе асмысьлена рэдакцыяй, тым больш шансаў на хуткае выпраўленьне памылак.

Вывучаючы камплекты «Калгасьніка Беларусі», прыходзіш да вываду, што рэдакцыя гэтай цэнтральнай газэты ў пытаньнях барацьбы за разгортваньне гандлю с.-г. прадуктамі зусім недалёка адышла ад раённай «Калгаснай праўды».

Некаторая розьніца, праўда, ёсьць. У «шапках» пад аддзеламі і палосамі з матар'ламі аб пасеўнай кампаніі дзесяткі раз успамінаюцца пастановы ЦК і СНК аб загатоўках і калгасным гандлі.

Газэта зусім правільна робіць, калі на аснове папулярызацыі апошніх пастаноў партыі і ўраду мабілізуе масы калгасьнікаў і адпаасобнікаў на барацьбу за якасьць работы, за скарачэньне тэрмінаў сяўбы.

Ня так стаіць справа з калгасным гандлем. Гэту важнейшую частку работы рэдакцыя **прагледзела, калі не сказаць большага.**

Недапушчальна для цэнтральнай сялянскай газэты ня даць па працягу апошніх трох месяцаў хаця-б некалькі артыкулаў, у якіх-бы папулярна рассказаць аб значэньні калгаснага гандлю, аб парадку яго разгортваньня. За выключэньнем перадрукаванага з «Праўды» артыкулу тав. **М. І Калініна** рэдакцыя нічога не дала.

Забыўшыся пра растлумачальную, папулярызатарскую работу, «Калгасьнік Беларусі» (з пэўнай пасьлядоўнасьцю) толькі калі-ні-калі ўспамінае пра разгортваньне калгаснага гандлю ў нашай рэспубліцы.

Нават той матар'ял, які зьмешчан, носіць у большасьці выпадкоў характар **і ні кроплі ініцыятывы рэдакцыі.** Няма намёку аб арганізатарскай дзейнасьці.

Уласна кажучы, намёк ёсьць. І нават моцны намёк калгасьнікаў **па адрасе рэдакцыі.**

> **«Дарагія таварышы! Мы, калгасьнікі і калгасьніцы, удзельнікі першага савецкага базару ў нашым раёне ў колькасьці 30 калгасаў і 130 калгасьнікаў па закліку РК КП(б)Б, РВК, райкалгассаюзу і райпрафсавету сёньня першы раз выступілі з пішкамі сваёй сельска-гаспадарчай прадукцыі на савецкі базар. Мы поў насьцю ўхваляем пастановы партыі і ўраду аб разгортваньні калгасна-саўгаснага гандлю».**

Так пісалі калгасьнікі—удзельнікі першага масавага выезду на барысаўскі рынак. Яны зьвярнуліся:

> **«да ўсіх калгасьнікаў Барысаўскага раёну і ўсёй БССР і адпаасобнікаў—беднякоў і сярэднякоў—бездакладна пасьледаваць нашаму прыкладу ў арганізацыі масавых калгасна-саўгасных базараў».**

Калі ўжо рэдакцыя аказалася ня здольнай праявіць сваю ініцыятыву, дык падхапіць заклік перадавікоў, зрабіць яго выходным пунктам сваёй арганізатарскай работы ў гэтай галіне здавалася-б проста абавязак «Калгаснікі Беларусі».

Ня ўспомніла, аднак, пра гэты ліст рэдакцыя, маўчыць аб ім камплект газэты.

Прайшло больш месяца (з 12 мая да 18 чэрвеня). За гэты час газэта зьмясьціла ў розных нумарох, прычым на розных старонках, 4 невялічкія заметкі. І далей—20 чэрвеня карэспандэнцыя з Асіпавіч, 25—з Асьвеі.

З аднэй карэспандэнцыі мы даведваемся, што калгасьнікі «Новага шляху», Сарачынскага сельсавету, Вушацкага раёну,

> **«абавязаліся пасьля выкананьня пляну здачы (продажу) дзяржаве прадаць на рынак жыта 15 тон, ячменю—25 цэнтн., гароху—25 цэнтн., авёса—16, капусты—10 тон, каровы — 10 штук, авечак—10 штук, цялят—20 штук і рознага другога мяса—5 цэнтн».**

Для таго, каб рэалізаваць свае абавязацельствы, калгас засеяў дадаткова плошчу адпаведнымі культурамі. Апрача гэтага

> **«калгасьнікі абавязаліся павялічыць звыш пляну стада сьвіней і інш. жывёлы ў калгасе».**

Які **багаты зьмест** маленькай па разьмеры (20 радкоў) заметкі. Багаты таму, што **выпуклена галоўнае**—стварэньне базы для далейшага разгортваньня калгаснага гандлю.

Змагацца за дадатковы засеў дзесяткаў і соцень га, за пашырэньне гадоўлі жывёлы, за стварэньне дадатковых прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы, прадукцыя якіх будзе рэалізавана праз калгасны гандаль — у гэтым, між іншым, побач з барацьбой за прасоўваньне прамтавараў у пёску заключаецца важнейшая задача, «К. Б».

Матар'ялы, зьмешчаныя ў газэце, паказваюць, што рэдакцыя не ўхапілася за гэта зьвяно, яе разьвіла патрэбнай работы.

А гэта зрабіць ужо даўно пара. Пара!

Прамкаапэрацыя—важнейшае зьвяно барацьбы за павялічэньне таварных рэсурсаў

Прамкаапэрацыя займае значную ўдзельную вагу ў вырабе прадметаў шырокага спажываньня. Досыць паказаць, што праграма **тэкстыльнага аб'яднаньня** Белпрамсаюзу ў галіне вырабу прадметаў шырокага спажываньня ў 2-м квартале складае каля 12 млн.руб., гарбарна - абутковага — 9 млн. руб., мэталапрацоўчага —480 тыс. руб. Ад выразнасьці работы прамкаапэрацыі, ад яе здольнасьці перакліочыцца на выраб прадукцыі шырокага спажываньня ва многім залежыць справа рабочага снабжэньня. Дырэктывы партыі і ўраду абавязваюць прамкаапэрацыю разгарнуць работу па ўцілізацыі адкідаў вытворчасьці, па адшуканьні дадатковых сырцовых рэсурсаў.

Як-жа прамкаапэрацыя ажыцьцяўляе гэтыя важнейшыя задачы? Гарбарна - абутковае аб'яднаньне Белпрамсаюзу выканала вытворчы плян за 5 месяцаў гэтага году ў разьмеры 8 млн. руб. — на 24 проц. гадавога заданьня.

Праграма 3-га кварталу значна павялічана ў параўнаньні з папярэднім і складае 9.924.000 руб. Яна павялічана за кошт зьмяшэньня вырабу спэцабутку, аануляваньня раду дагавароў, уцілізацыі адкідаў і ўжываньня сурагату. Больш паловы гэтай праграмы займае рамонт абутку.

Аднак, канкрэтныя меры да выкананьня гэтай павялічанай праграмы яшчэ ня прыняты. Аб'яднаньне абмежавалася дачай агульных дырэктыў. На прапягу 2-га і 3-га кварталу трэба арганізаваць 166 майстэрань па рамонце апрача 308 наяўных. Адкрыта толькі... 5.

Урад даў прамкаапэрацыі заданьне на працягу чэрвеня адкрыць у гарадох БССР 6 майстэрань для прыёмкі індывідуальных заказаў. Майстэрні на вінны пашыць у першы месяц работы 3.000 пар абутку. Адкрыты майстэрні ў 6 гарадох у сярэдзіне чэрвеня. Менскія майстэрні прынялі індывідуальных заказаў на 180 пар — 5 пар ужо зданы заказчыкам, 40 у рабоце. Вось уся інфармацыя, якую можна атрымаць у гарбарна - абутковым аб'яднаньні. Што робіцца ў іншых гарадох — невядома. Як можа Белпрамсаюз кіраваць гэтай справай, калі ён ня ведае, што робяць месцы і як выконваюцца важнейшыя дырэктывы ўраду?

Кіраўнікі гарбарна - абутковага аб'яднаньня скарджацца на недахват сыру, на дрэнае забесьпячэньне павялічанай праграмы скурсырцом. Яны забываюць аб тым, што галоўная задача прамкаапэрацыі — шырокае скарыстаньне адкідаў і адшуканьне дадатковых рэсурсаў. Сёе - тое ў гэтых адносінах робіцца: зьбіраецца і скупляецца стары пашошаны абутак; даны дырэктывы арганізаваць ларкі па абмену абутку. Аднак, дырэктывы з-за коснасьці і нягібкасьці раду раённых прамысловых саюзаў ня выконваюцца. Па лініі скурпа-галантарэйнай вытворчасьці пачаўся выраб прадукцыі з плёнкі — верхняга пласта скуры, пачала ўжывацца рыбная скура; скарыстаньне адкідаў вытворчасьці кажухоў, перадача іх (адкідаў) злоў у валяльныя майстэрні павінна даць прадукцыі на 26 тыс. рублёў. Але гэта толькі першыя вопыты. Уцілізацыя адкідаў для папярэдняга вырабу абутку яшчэ не набыла патрэбнага размаху.

Прыблізна такі-ж малюнак па **тэкстыльным аб'яднаньні,** якое кіруе работай швэйных, ткацкіх, панчошна-трыкатажных і вяровачных арцелей. І тут з фармальнага, з знадворнага боку ўсё гладка. Праграма павялічваецца за кошт скарыстаньня адкідаў, адшуканьня новых рэсурсаў сырцу, па швэйных арцелях з 10.700.000 р. у другім квартале да 12.000.000 руб. у 3-м, па трыкатажных—з 1.380 тыс. р. да 1.550 тыс. руб., па ткацкіх—з 400 тыс. да 460 тыс. руб. Але як забясьпечана выкананьне гэтай праграмы? Якія меры прыняты для поўнага ажыцьцяўленьня павялічаных заданьняў? Гэтыя пытаньні асабліва к месцу, калі ўлічыць, што за 5 месяцаў г. г. асноўныя галіны тэкстыльнага аб'яднаньня прамкаапэрацыі—швэйныя арцелі—выканалі гадавы плян на 37 проц., панчошная—на 39 проц., арцелі па выпрацоўцы чуць—на 12 проц.

Дырэктар тэкстыльаб'яднаньня Белпрамсаюзу тав. **Шварц** лічыць, што ўся бяда ва ўрэзваньні, зьмяншэньні каштэнгентаў сырцу асабліва па швэйнай прамысловасьці. Гэта ўрэзваньне ставіць пад пагрозу выкананьне пляну адкрыцьця майстэрань па індывідуальных заказах. Дагэтуль адкрыты майстэрні ў Менску, Барысаве, Бабруйску, на чарзе—Гомель, Віцебск, Магілеў. Рабочая сіла, памяшканьні падрыхтаваны, але вось сырэц... Мы пытаем у Тэкстыльаб'яднаньня, чаму яно не давяло да канца справу з перадачай прамкаапэрацыі часткі каштэнгентаў Белшвейаб'яднаньня, аб чым гаворыць пастанова СНК. Апошняя выканана далёка ня поўнасьцю. Важнейшае значэньне мае арганізацыя ўцільцэхаў для скарыстаньня адкідаў вытворчасьці швэйных фабрык і арцелей. Тут непачаты край работы. Паводле слоў тав. Шварца зараз толькі «ўзята лінія па арганізацыю ўцільцэхаў для вырабу з адкідаў дзіцячых шапачак, рэйтуз і інш.». У галіне рэстаўрацыі старой вопраткі, перапрацоўкі яе на дзіцячую робяцца толькі першыя вопыты і то ў адным горадзе — Менску.

Да апошняга часу прамысловая каапэрацыя не аддавала належнай увагі арганізацыі рамонтных швэйных майстэрань. Зараз адкрыты ў гарадох, раённых цэнтрах па буйных фабрыках і заводах 132 майстэрні ў той час, як да канца году павінна быць адкрыта 230.

У гэтай галіне ініцыятыва прамыслова-каапэрацыйных арганізацый часта натыкаецца на коснасьць і бюракратызм кіраўнікоў паасобных прадпрыемстваў. Адміністрацыя Бабруйскага камбінату на просьбы прадаставіць памяшканьне для майстэрні сярдзіта заявіла: «Можаце заняць увесь камбінат». На менскай абутковай фабрыцы ўдалося дабіцца памяшканьня толькі пасьля доўгіх спрэчак. Магілеўская шаўковая фабрыка абяцала адрамантаваць пакой, аказалася, што ён належыць ня фабрыцы, а ЦРК.

Пэўныя посьпехі дасягнуты ў адносінах уцілізацыі адкідаў па панчошна-трыкатажнай вытворчасьці. У БССР адкрыты 20 пунктаў па рамонце і абмене панчох. Такія пункты будуць таксама адкрыты пры радзе ЗРК. Заключая дагавор на скарыстаньне адкідаў трыкатажнай фабрыкі імя Клары Цаткін для вырабу шаўковых панчох, дзіцячых маек, шкарпэтак. Уцілізацыя гэтых адкідаў можа даць дадатковай прадукцыі на 800 тыс. рублёў.

Дзяржаўнай прамысловасьці БССР трэба дапамагчы прамкаапэрацыі ў адшуканьні новых рэсурсаў, у перапрацоўцы і скарыстаньні іх.

Прамкаапэрацыя павінна павярнуцца тварам да задачы вырабу з адкідаў прадметаў шырокага ўжытку. Яна павінна заняць адно з важнейшых месц у калёне барацьбітоў за выраб дадатковых таварных мас для шырокага рынку.

Б.

ГОЛАС НАСЬЦЕНГАЗЭТЫ НЕ ПАЧУТ

Насьценгазэта калгасу **«Шляхі Ільліча», Мсьціслаўскага раёну,** якая выдаецца ячэйкай ЛКСМБ гэтага калгасу, заўсёды выкрывае недахопы ў арганізацыі працы калгасу, арганізоўвае масы калгасьнікаў на выкананьне пляну.

9-га ліпеня ў насьценгазэце было ўказана на дрэнныя адносіны некаторых калгасьнікаў да коняй, на позьні выхад на работу.

У гэтым - жа нумары было ўказана, што **рахункавод калгасу Новікаў за - гадчык** сьвінафэрмы **Бялкоў** у часе гарачай работы гуляюць у футбол, а не працуюць непасрэдна на вызначанай для іх рабоце.

Праўленьне калгасу не рэагуе на матар'ял, зьмешчаны ў насьценгазэце, тым самым даючы патачку зрыўшчыкам справы арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Бабкоў.

За што мяне зьнялі з работы?

(Ліст старшыні калгасу)

Я батрак. Кандыдат КП(б)Б. Да 1928 году працаваў батраком, а потым 3 гады рабочым на цагельні.

Пасьля цагелы **пайшоў у калгас,** які мяне паслаў на аднагадовыя **курсы старшынь калгасаў.**

Скончыўшы курсы, мяне накіравалі ў калгас **«Савецкая Беларусь», Ельскага раёну,** дзе я і працаваў **9 месяцаў у якасьці старшыні праўленьня калгасу.**

Гэты калгас быў амаль разбуран. Я ўзяўся за наладжаньне калгаснай гас падаркі. Кулакі і падкулачнікі, пралезшыя ў калгас, бачачы маю актыўнасьць **па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, парашылі дабіцца зьняцьця мяне з пасады старшыні.**

Яны сталі пісаць лісты ва ўсе ўстановы, у якіх рабілі **паклёпы** на мяне, нібы я разбураю калгас. Яны сваю работу па разбурэньні калгасу сталі прыпісваць мне.

Райкалгассаюз, не праверыўшы фактаў і не расьсьледаваўшы гэтай справы, **зьняў мяне з работы.**

Я ня ведаю, за што мяне зьнялі з работы. Я чакаю найхутчэйшага расьсьледваньня маёй справы судова-сьледчымі органамі.

Машкоўскі Андрэй.

Хватчэўскі змагаецца за партфэль

(Ліст рабочага торфазаводу)

Хватчэўскі Мікодым быў адзін час дырэктарам торфазаводу **«Зьвязда».** Быў дырэктар, а потым стаў памочнікам дырэктара, бо ня справіўся са сваімі абавязкамі.

Прыехаў **новы дырэктар т. Царанкоў Максім,** які значна палепшыў справы заводу.

Хватчэўскі пакрыўджан. Ён імкнецца адпомсьціцца за «зьнявагу» і ўсялякімі мэтадамі хоча падарваць работу торфазаводу, **перашкодзіць працы тав. Царанкова.**

Хватчэўскі кідаецца ва ўсе бакі, каб толькі «заваяваць» пасаду дырэктара.

Дырэктар заводу тав. **Царанкоў даў распараджэньне аб арганізацыі перавозу рабочых** праз раку **Пціч. Хватчэўскі** па невядомых прычынах гэтае распараджэньне адмяніў. **Рабочым прыходзіцца часта пазьніцца на работу з-за адсутнасьці перавозу.**

У «заслугу» **Хватчэўскага** патрэбна паставіць і разбазарваньне прадуктаў, вызначаных для рабочых.

Бельторф павінен пакласьці канец учынкам Хватчэўскага.

Рабочы.



МАНТАЖ МЭТАЛЕВЫХ КАНСТРУКЦЫЙ ДЛЯ БУДЫНКУ БЛЮМІНГУ Ў МАГНІТАГОРСКУ

Сыгнал з Баранскага сельсавету

— Хто такі Віктар Мігуцкі?

— Звыш 15 гадоў — рабочы Бранскіх і Ленінградзкіх мэталюргічных заводаў. З 1923 году — селянін серадняк, атрымаў 2 га сенапашні, працаваў на ёй і плаціў 6-7 руб. падатку. У 1931 годзе, у сувязі з зямляўпарадкаваньнем, яму прырэзалі дадатковы 0,85 га пахаці і 1,95 га сенажаці. Падатку пачаў плаціць 29 руб. Меў адну карову. У апошні час — калгасьнік.

Такава сьціслая біяграфія Мігуцкага.

Праўда, істотным дадаткам да яе будзе яшчэ і тое, што Мігуцкі Віктар — член калгасу «Завет Леніна», Баранскага сельсавету, Барысаўскага раёну — актыўны грамадзкі і селькор.

Гэта акалічнасьць якраз і ёсьць прычына ўзьнікненьня алісканых ніжэй падзей, рэзалюцый і тэлеграм...

... 19 сьнежня 1931 году адбылося аб'яднаньне двух калгасаў Баранскага сельсавету — «Завет Леніна» і «Хрост». Кіраўнікі новаарганізаванага ўзбуйненага калгасу — Рогаў і Лабаноўскі, захопленыя любоўю да алкаголю, растрачваюць калгасныя грошы. Ад іх не адстае член праўленьня калгасу Брухачэўскі. Грошы, атрыманыя калгасам за продаж тых ці іншых прадуктаў, ня ўлічваюцца.

Усё гэта заўважае гаспадарчае вока калгасьнікаў, а ў тым ліку і Мігуцкі. Ня можа ён заставацца бестароннім сьведкай усіх гэтых злачынстваў. Мігуцкі аб Баранскіх справах сыгналізуе Барысаўскаму райкалгассаюзу. Трывожны сыгнал калгасьніка дайшоў да адрасата. Гэта факт. Інакш не магла-б на заяве Мігуцкага зьявіцца рэзалюцыя аднаго з адказных работнікаў райкалгассаюзу:

«Баранскаму сельсавету. Высьветліць» І кропка.

У сельсавеце-ж падыйшлі да справы больш проста. Заяву з рэзалюцыяй палажылі ў папку і больш яе адтуль ня выймалі. Адначасова сельсаветчыкі і кіраўнікі калгасу далі зразумець аўтару заявы, што, калі ён хоча і надалей быць калгасьнікам і ня хоча атрымаць цьвёрдага заданьня, хай лепш ня траціць часу на падобнае выкарыстаньне сваёй пісьменнасьці...

Аднак, гэтыя парады начальства не задавальняюць Мігуцкага і ён з ранейшай настойлівасьцю змагаецца за здаровую калгасную гаспадарку. У другі раз ён ужо зварачаецца за дапамогай да раённага начальніка міліцыі. Але, як і ў першым выпадку, адрасат аднёсься да заявы па меншай меры стрымана і абмежаваў свой удзел у Баранскай справе лёканічнай візай на кутку заявы:

«Старшыні райКК-РСІ. Прыцягнуць да адказнасьці па партыйнай лініі».

Старшыня райКК-РСІ тав. Ліхэрзак па заяве Мігуцкага напісаў: «Жортаўскі сельсавет. Сакратару сельпарткому т. Лукашэўскаму».

Як паказаў далейшы ход справы чарговы адрасат — Лукашэўскі палічыў, што атрыманая ім заява ні да чаго яго не абавязвае і акуратна падшыў яе у папку — «да ведама». Мігуцкі-ж цярпліва чакаў адказу, або рэагаваньня. І чакаў ня мала — не адзін і ня два дні, а 90 дзён. 3 месяцы!

За гэты час, карыстаючыся выключнай бястурботнасьцю і адменнай флегматычнасьцю раённых работнікаў, Баранскія героі працягвалі пачатую імі справу. Разбазарвалі за бесцань і прысвойвалі сабе былую кулацкую маемасьць, мэблю, швэйныя машыны і г. д.

Мігуцкі ня траціць надзеі. Ён патрабуе ўмяшаньня абаронцы рэвалюцыйнай законнасьці — райпракурора. Пракурор, прачытаўшы заяву, чакіраваў яе начальніку міліцыі. Трэцяя заява Мігуцкага пераходзіць да начальніка міліцыі, дзе на ёй робіцца стэрэатыпная адзнака:

«Старшыні райКК-РСІ. Далучыць да ранейшай справы, дасланай нам 14-III — 1932 году».

Нам невядома, ці была гэта заява «далучана да ранейшай справы», ці яна ні да чаго ня была далучана. Вядома толькі тое, што Мігуцкі прымушаны быў аб усім гэтым напісаць у рэдакцыю газэты «Зьвязда».

Такая пасьлядоўная настойлівасьць Мігуцкага, нарэшце, вывела з цярпеньня ініцыятараў і арганізатараў злачынстваў у Барані. Яны паранілі ва што-б там ні стала прымусіць непаседлівага сельскора замаўчаць. Па ініцыятыве калгаснага старшыні Рогава і галавы сельсавету Калясеі, Мігуцкі без санкцыі агульнага сходу калгасьнікаў быў выключан з калгасу і, апрача таго, прэзыдыум сельскага савету даў яму цьвёрдае заданьне.

Ня маючы ніякай маемасьці і прадуктаў, Мігуцкі ня выканаў заданьня Калясеі. Ён ня мог. Аднак, кіраўнікі сельсавету не знайшлі патрэбным лічыцца з гэтым. Наадварот! Іх мэтай было — як належыць правучыць свайго ворага. Іх дэвізам было — наступаць. І яны наступалі:

«Мігуцкаму. Баранскі сельсавет прапануе вам з атрыманьнем гэтага ў 10-гадзінны тэрмін (так, так — у 10 гадзінны!) унесьці ў сельсавет 200 руб. 90 к. штрафу...».

...І толькі тады, калі ў Баранскі сельсавет выехаў прадстаўнік газэты «Зьвязда», раённыя кіраўнікі зразумелі сваю памылку і пачалі варушыцца. Старшыня райКК-РСІ тав. Ліхэрзак тэлеграфаваў:

«Лукашонку. Тэрмінова выязджай на прэзыдыум тчк Захапі з сабою Рогава зпт твой даклад аб Мігуцкім тчк»...

Зараз Мігуцкі адноўлен у правах калгасьніка. Аб цьвёрдым заданьні яму ўжо не ўспамінаюць. Новае партыйнае кіраўніцтва Барысаўшчыны па-бальшавіцку паступіла з непасрэдным вінаватым цкаваньня Мігуцкага. Пастановай райкому партыі камуністы Рогаў і Калясень атрымалі суровыя спагнаньні. Справай займаецца пракурор. Сакратар Баранскай партыйнай ячэйкі — Мышчык — выключан з партыі.

Да рэчы — хто такі Мышчык?

— Асоба, якая выпадкова мела партыйны білет, якая ніколі не парывала сувязі са сваякамі — ліпэнцамі, духоўнай годнасьці і іншымі варожымі элемэнтамі, асоба, якая выкарыстоўваючы сваё грамадзкае становішча, прысвойвала сабе дзяржаўную маемасьць, жывёлу і г. д.

Баранаўская справа—сур'ёзны сыгнал, які прымушае нас быць больш чулымі да голасу працоўных мас, праяўляць больш клясавай пільнасьці і рашучасьці ў барацьбе з кулаком і героямі права-«лявацкай» практыкі. З гэтай справы павінны зрабіць урокі рад раённых арганізацый Барысаўшчыны, бо ў ёй міліцыя, райкалгассаюз, пракуратура праявілі недапушчальныя бюракратычныя адносіны да актыўнага ўдзельніка сацыялістычнага будаўніцтва.

Так кадраў не падрыхтуеш

Асноўнай задачай **Стара-Барысаўскага сьвінагадоўчага тэхнікуму** зьяўляецца **падрыхтоўка спэцыялістаў для сацыялістычнай жывёлагадоўлі.** Пры тэхнікуме таксама існуе пэдпадзяленьне для падрыхтоўкі **настаўнікаў саўгасвучаў.**

Справа падрыхтоўкі настаўнікаў для саўгасвучаў зрываецца. Праграма гэтага курсу ня выконваецца.

Яшчэ горш стаіць справа на першым курсе веснавога набору **1932** году. На гэтым курсе **было 30 студэнтаў. Зараз засталося ўсяго 16. 14 студэнтаў уцякі** з тэхнікуму, бо дырэкцыя і арганізацыі тэхнікуму на сустрэлі новых студэнтаў як належыць. **Да гэтага часу яшчэ не размеркаваны стыпэндыі.**

Зараз неабходна ўзяцца за вярбоўку новых студэнтаў из першы курс тэхнікуму. Але і ў гэтай справе яшчэ нічога ня робіцца. Дырэктывы партыі ў жыцьцё не праводзяцца. Тэхнікум яшчэ не перабудаваў сваёй работы.

Лісоўні.

Па сьлядох лістоў рабселькораў

Селькор з **Рэчыцкага** раёну напісаў у нашу газэту аб тым, што рэчыцкі дагранкон займаецца самазабесьпячэньнем. У гэтай справе замешаны ўсе члены праўленьня, вакол якіх сабралася цэлая група самазабесьпячэнцаў.

Атрыманыя для рабочых боты трапляюць на прыватны рынак. Тое-ж самае было і з прадуктамі.

Ды расьсьледваньні факты поўнасьцю падцьвердзіліся. Рэчыцкая РКК - РСІ пастанавіла ўвесь матар'ял перадаць сьледчаму для прыцягненьня вінаватых да адказнасьці.

Старшыні праўленьня **Гульману** абвешчана суровая вымова з папярэджаньнем.

***

Па лістох рабселькораў у «Зьвязду» аб тым, што старшыня **Жарыцкага** сельсавету **Жышпар,** старшыня калгасу «Перамога» Сідляронак пакрываюць заможнікаў і кулакоў, было праведзена расьсьледваньне. Увесь матар'ял падцьвердзіўся. Пастанова РКК справа ў адносінах Жышпара і старшыні калгасу «Перамога» перадана на разгляд РКК-РСІ.

Максымум увагі камуністычнаму выхаваньню падрастаючага пакаленьня

Пытаньне аб рабоце з піянэрамі заняло даволі шырокае месца ў рабоце пленуму ЦК ЛКСМБ. Даклады **т. т. Ляхава і Русакевай АБ РОСЬЦЕ І СТАНЕ ПАЛІТВЫХАВАНЬНЯ ПІЯНЭРАРГАНІЗАЦЫЙ І ДЗЯЦЕЙ** абмаркоўвалася з пункту гледжаньня выкананьня пастановы ЦК УсеКП(б) аб рабоце сярод піянэраў і пастановы аб школе.

Піянэрскі рух у БССР узьняўся на вышэйшую ступень. Шматтысячныя масы працоўнай дзетвары пад кіраўніцтвам партыі і камсамолу праз піянэрскі рух далучыліся да новага грамадзкага жыцьця, значна пашырылі свой грамадзкі палітычны сьветапогляд.

Узросны піянэрскі рух, павышэньне цягі працоўнай дзетвары ў піянэрарганізацыі, задача ператварэньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых і актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва патрабуюць павышэньня якасьці камуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня, натрабуюць мабілізацыі яго на барацьбу за аўладаньне асновамі навук, за палітэхнічную школу, за павышэньне культурнага і палітычнага ўзроўню дзяцей.

Між тым, работа ў піянэрарганізацыі па камуністычным выхаваньні па стаўлена слаба. Таксама невыстарчальна разгорнута работа па росьце піянэрарганізацыі і замацаваньні новага папаўненьня. У гэтай галіне работы паасобнымі арганізацыямі дапушчаны скажэньні. Штучнае затрымліваньне росту, масабоязьнь, мэхаічны запіс у атрады дзяцей і г. д. — усё гэта мае месца. У **Менскай** піянэрарганізацыі, як гэта адзначалі ў сваіх выступленьнях таварышы,—сыстэматычная выхаўчая работа сярод дзяцей падмяняецца «ўдарнай» вярбоўкай, мэхаічным запісам. У часе правядзеньня кампэрэнцыі неарганізаваных дзяцей за адзін раз запісана ў піянэрарганізацыю больш 500 дзяцей. Што-ж датычыць **замацаваньня** росту, дык **на гэта не зварачаецца належнай увагі.** Зараз больш 20 проц. атрадаў, якія ёсьць у Менску, нічым не займаюцца. Каля 50 проц. піянэратрадаў не забясьпечана піянэржажатымі. Ня дзіва, што пры такіх умовах наглядаецца вялікі адсеў.

Наколькі суха і фармальна падыходзяць некаторыя арганізацыі да работы сярод дзяцей, падала характэрны прыклад тав. **Воліс.** У першай Менскай школе прапрацоўвалі шэсьць умоў тав. Сталіна такім парадкам: у групе звыш 30 чалавек аднаму вучню даручылі чытаць «Шэсьць умоў тав. Сталіна». І калі была прачытана ўся кніжка, тады кіраўнік задае пытаньне: «Што такое першая ўмова». Зразумела, што пры такім мэтадзе прапрацоўкі дзеці не змаглі ўсвоіць зьмест.

Аб слабай пастаноўцы выхаваўчай работы ў піянэрарганізацыі гаварылі амаль усе выступаўшыя таварышы. У некаторых школах вядзецца невыстарчальная барацьба з праяўленьнямі клясава-варожых тэндэнцый. Толькі прытупленьнем клясавай пільнасьці некаторых камсамольскіх ячэек можна вытлумачыць такое становішча, калі ў некаторых школах **Дрысенскага, Аршанскага, Лельчыцкага і Менскага** раёнаў яшчэ да гэтага часу карыстаюцца падручнікамі, якія адлюстроўваюць нацдэмаўскую ідэалёгію і іншым старым хламам, у якім можна знайсьці такія перлы, як «бяз бога не да парога» і г. д.

Мэтадам бальшавіцкай самакрытыкі пленум выкрыў усе недахопы, якія ёсьць у рабоце камсамольскай арганізацыі па выхаваньні піянэраў. **Пленум рашуча асудзіў апартуністычныя разважаньні сакратара Лельчыцкага РК ЛКСМБ—Марчанкі,** які ў сваім выступленьні, адлюстроўваючы ўласныя ўпадніцкія настроі, імкнуўся давесьці, што «піянэрская арганізацыя развальваецца і ўмацаваць яе няма магчымасьці». Спробы Марчанкі ўзвесьці ў правіла, абагуліць на ўсю арганізацыю сваю апартуністычную практыку і злачынную бязьдзейнасьць, спробы прапагандаваць з трыбуны пленуму апартуністычнае нівер'е ў сілы сустрэлі належны бальшавіцкі адпор.

У ліку практычных мерапрыемстваў далейшай работы пленум паставіў задачу—арганізаваць пры кожнай вытворчай і калгаснай камсамольскай ячэйцы піянэратрады. Першачарговай задачай высунута павышэньне культурнага і палітычнага ўзроўню дзяцей, аўладаньня ведамі, узмацненьня разгорнутай работы ў школе.

Неабходна ўзмацніць работу па арганізацыі піянэраў ва барацьбу за выразны распарадак у школе, рацыянальнае выкарыстаньне вучэбнага часу і ўстанаўленьне сувязі вучэбнай работы з грамадзкім жыцьцём.

Усе гэтыя задачы, высунутыя пленумам у галіне работы з піянэрамі, з посьпехам будуць ажыцьцёўлены пры ўмовах, калі мясцовыя і партыйныя арганізацыі большую ўвагу аддадуць гэтай важнейшай задачы.

Сотні новых спэцыялістаў, якія скончылі пралетарскія ВНУ

Канчаецца вучэбны год у нашых ВНУ і ВТНУ. У сёлетнюю кампанію, як і ў папярэднія гады, нашы вышэйшыя школы, ажыцьцяўляючы задачы партыі, выпусьцілі сотні новых спэцыялістаў, узялі ў сапыялістычнае будаўніцтва вялікую армію новых пралетарскіх кадраў.

Кожны чарговы выпуск, кожная новая сотня спэцыялістаў, выхаваных у пралетарскіх вышэйшых школах і тэхнікумах, зьяўляюцца вялікім сьвятам ня толькі для адпаведных ВНУ, але і для ўсёй краіны, усёй пралетарскай грамадзкась

АДКРЫЛАСЯ VII УСЕСАЮЗНАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ УсеЛКСМ

1-га ліпеня ў 7 гадзін вечара ў пераапоўненай Калённай залі Дому Саюзаў **адкрылася VII усесаюзная канфэрэнцыя УсеЛКСМ.** Бурнымі аплёдысмэнтамі і крыкамі «ура» дэлегаты, якія сабраліся з усіх канцоў Савецкага саюзу, сустрэлі зьяўленьне на трыбуне генэральнага сакратара УсеЛКСМ **тав. Косарава,** які адкрыў канфэрэнцыю наступнымі словамі:

— Дэлегатам VII усесаюзнай канфэрэнцыі ленінскага камсамолу ад імя ЦК УсеЛКСМ я перадаю баявое камсамольскае прывітаньне. Наша канфэрэнцыя сабралася на рубяжы дзьвёх эпох, калі наша краіна грунтоўна зьмяніла свой твар. Мы становімся мацнейшай краінай у сьвеце, заканчваем пераможна выкананьне першага пяцігадовага пляну і прыступаем да распрацоўкі другога. І калі камсамол аказаўся на вышыні сваіх задач у часе першай пяцігодкі, дык няма ніякіх сумненьняў у тым, што і ў часе другой пяцігодкі наш саюз з гонарам будзе насіць імя ленінскага чырвонасьцяжнага камсамолу. Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ленінскі камсамол будзе верным і адважным абаронцай нашага сацыялістычнага будаўніцтва ў будучых клясавых баёх.

На прапанове тав. **Лук'янава** ад імя маскоўскай, ленінградзкай, украінскай і іванаўскай дэлегацый канфэрэнцыя выбірае прэзыдыум у складзе 40 чалавек, сакратарыят у складзе 15 чалавек, рэдакцыйную камісію ў складзе 16 чал. У склад прэзыдыуму канфэрэнцыі ўвайшлі: **т.т. Косараў, Салтаноў, Андрэеў, Швернік (УсеЦСПС), Чмаданаў (КІМ) С. Алексіс (нач. вайск. паветран. сіл), Арлоў (нач. вайск. мор. сіл.), Эйдман (Асоавіяхім), Лук'янаў (Масква), Гусеў (Ленінград), Войчанка (Украіна) і інш.**

Пад бурныя воплескі ганаровы прэзыдыум канфэрэнцыі выбіраецца ў наступным складзе: **т.т. Сталін, Молатаў, Кагановіч, Варашылаў, Калінін, Арджанікідзэ, Андрэеў, Куйбышаў, Кіраў, Касіёр Ст., Рудзутак, Постышаў, Мікаян, Тэльман і Горкі.**

Бурнай працяжнай авацыяй канфэрэнцыя сустракае членаў палітбюро ЦК УсеКП(б).

Канфэрэнцыя зацьвярджае наступны парадак дня:

1. Чацьверты завяршальны год пяцігодкі і чарговыя задачы камсамолу (ударніцтва, сацпаборніцтва і г. д.)—даклад **тав. Косарава.** 2. Рост камсамолу і пітэрарганізацыі і стан палітыка-выхаваўчай работы ў камсамоле і сярод шпэраў—даклад тав. **Салтанава.**

* * *

Пасьля ўступнай прамовы **т. Косарава** і выбараў кіруючых органаў канфэрэнцыі і ганаровага прэзыдыуму, з рапартамі пэфу выступілі начальнік вайскова-морскіх сіл РСЧА тав. **Арлоў** і начальнік вайскова-паветраных сіл РСЧА тав. **Алексіс.**

Тав. **Яраслаўскі** вітаў канфэрэнцыю ад імя таварыства старых бальшавікоў. Дэлегатаў віталі пітэры і акцябраты базы электразаводу, баец асобнай далёка-ўсходняй арміі тав. **Архіменка** і патранічнік **Пірагоў.**

Канфэрэнцыя паслала **прывітаньні ЦК УсеКП(б), Саўнаркому СССР, Рэвваенсавету і Камінтэрну.**

„ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ ПАВІНЕН ЗНАХОДЗІЦЦА Ў САМОЙ ГУШЧЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА"

З дакладу тав. Косарава на VII усесаюзнай канфэрэнцыі

На ранішнім і вячэрнім пасяджэньні 2 ліпеня VII усесаюзная канфэрэнцыя КСМ заслухала даклад **т. Косарава аб чацьвертым завяршальным годзе пяцігодкі і аб чарговых задачах камсамолу.**

У сваім дакладзе т. Косараў намаляваў карціну буркага сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР і катастрафічнага западу ўсёй гаспадаркі ў краінах капіталу ў рэзультаце нябывалага эканамічнага крызісу ва ўсім сьвеце, апрача СССР.

Устаноўленыя на эстрадзе два вялікіх шчыты, электраабсталяваныя з лічбовымі дашмі аб становішчы вытворчасьці — адзін у форме чырвонай воркі з сярпом і молатам, а другі ў форме расколатай кліном крызісу чорнай фашысцкай эмблемы — наглядна ілюстравалі даклад т. Косарава.

— Задачы чацьвертага завяршальнага году першай пяцігодкі,—сказаў тав. Косараў, — патрабуюць ад маладога пакаленьня Савецкага саюзу актыўнага ўдзелу на ўсіх без выключэньня вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Ленінскі камсамол павінен знаходзіцца ў самой гушчы будаўніцтва і з выразнай дзелавітасьцю і практычнасьцю, але адначасова з запалам і непрымірымасьцю змагацца за яго посьпех. Асноўнае, што павінен рабіць камсамол — гэта рыхтаваць новыя і новыя кадры кваліфікаваных маладых байцоў для разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва. Лёзунгам камсамолу павінна быць: «Культурна жыць, прадукцыйна працаваць — нармальным ходам, без партызанщчыны, але ў поўным аб'ёме ўсіх сіл і магчымасьцяй».

Тав. Косараў асабліва падрабязна спыніўся на пытаньнях ударніцтва і сацыялістычнага спаборніцтва маладых рабочых у прамысловасьці і маладых калгаснікаў у сельскай гаспадарцы.

* * *

Пад бурныя аплёдысмэнты канфэрэнцыя пастанавіла паслаць прывітаньне правадыру і настаўніку ленінскага камсамолу **тав. Сталіну,** а таксама таварыству старых бальшавікоў.

У Вялікім Доме Саюзаў адкрыта выстаўка мэталюргіі і авіямотабудаўніцтва. Выстаўка адлюстроўвае геранічную барацьбу камсамолу за эканамічную незалежнасьць СССР. Сьветавыя штрыхі, дыяграмы, лічбы з фотаілюстрацыямі і навейшыя савецкія мадэлі новых тэхнічных пабудоў яркамалююць карціну гіганцкага росту сацыялістычнай прамысловасьці і катастрафічнага ўпаду капіталістычнай вытворчасьці.

Вялікае ўражаньне пакідаюць мадэлі гіганцкага блюмінгу, выпушчанага на Іжорскім заводзе, электрапрывод да блюмінгу магутнасьцю ў 7 тыс. конскіх сіл.

На вялізарных шчытох, усеяных лічбамі і ілюстрацыямі, 1.300 школ ФЗВ рапартуюць канфэрэнцыі аб выніках усесаюзнага спаборніцтва ФЗВ. У часе спаборніцтва ФЗВ значна вырас камсамол у фабзавучах, павысілася працоўная дысцыпліна, 38 школ выпусьцілі 582 варштаты, многія з якіх раней імпартаваліся з-за граніцы.

У файэ Калённай Залі арганізаваны таксама аддзелы падшэфнікаў-камсамольцаў вайскова-паветранага і морскага флётаў. Адкрыт аддзел Асоавіяхіму.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

ЗАКАЗ НА СУШЫЛЬНЫ БАРАБАН ВЫКАНАН

Атрыманы машынабудаўнічым чырвонасьцяжным заводам імя **Варашылава** ад Маскоўскага савету нянялнавы заказ на сушыльны барабан, які раней увозіўся з-за мяжы і прызначаны для работ па дабрабыту чырвонай сталіцы СССР, дзякуючы энтузіязму ўдарнікаў і ІТР, пад кіраўніцтвам партыйнага калектыву, зроблен датэрмінова—1-га ліпеня 1932 г.

Гэтым рабочы калектыў заводу ўпісаў яшчэ адну перамсту на шляху «дагнаць і перагнаць у тэхніка-эканамічных адносінах перадавыя капіталістычныя краіны».

Запэўніем партыю і ўрад, што мы, варашылаўцы, і надалей пойдзем на шляху сваячасовага і якаснага выкананьня астатніх 12 сушыльных барабанаў, якія прызначаны для асноўных нашых гігантаў сацыялістычнай індустрыі—заводаў чорнай мэталюргіі.

Дырэктар заводу—**Валаханскі.**
Сакратар парткалектыву—**Іваноў.**
Старшыня заўкому—**Мінковіч.**

Пускаецца завод тарфяных машын

ІВАНАВА-ВАЗЬНЯСЕНСК. 1 ліпеня ўступае ў строй першы ў Савецкім саюзе завод тарфянога машына-будаўніцтва. Змантаваны і знаходзіцца ў поўнай гатоўнасьці ўсё абсталяваньне.

Да 1 студзеня завод выпусьціць 42 машыны для здабычы торфу коштам у 2½ млн. руб.

Ленінградзкая прамысловасьць будзе мець сваю апалавую базу

ЛЕНІНГРАД. Гэтымі днямі закончана праходка вопытнай шахты дасьледчай Гдорскай сланцавай капальні, якой дана імя Кірава. Ужо першыя дні яны кажуць аб выключна высокай якасьці гдорскіх сланцоў. Па сваёй калёрыйнасьці (4-5 тыс. калёрый) яны далёка перавышаюць вэймарскія сланцы, паветраны сухі торф, падмаскоўны вугаль (3 тыс. калёрый) і па сваёй цёплатворнасьці набліжаюцца да мясцовага вугалю.

Блізкасьць Гдорскіх месцанараджэньняў, якія знаходзяцца ў 180 клм. ад Ленінграду, забясьпечвае стварэньне магутнай апалавай базы для ленінградзкай прамысловасьці.

Паводле пастановы Абкому УсеКП(б), ужо ў гэтым годзе пачнецца будаўніцтва Гдорскіх сланцавых капалень. Першыя дзьве магутныя капальні прадукцыйнасьцю ў 1 млн. тон кожная закладваюцца ў сьнежні 1932 году. У будучым годзе Гдорскія сланцавыя месцанараджэньні павінны даць 166 тыс. тон сланца.

Сельгасмашыны

Завод **«Чырвоны мэталіст»** (Віцебск) за 28 чэрвеня выпусьціў 31 барану «Зіг-Заг», што складае 7 проц. сутачнага заданьня. За 29 чэрвеня зроблена 12 бульбакапалак і 6 боран «Зіг-Заг». Дзенны плян па вырабу гэтых машын выканан на 28,5 проц.

На Менскай электрастанцыі

За 3-ю дэкаду чэрвеня Менская электрастанцыя выпрацавала 617.932 клв. гадзін электраэнэргіі, замест пляновых 700 тыс. клв., што дае 88,3 проц. пляну за дэкаду.

На працягу дэкады было 3 г. 11 м. прастою фідэраў, што выклікала страты электраэнэргіі на 1.168 клв.-гадзін.

Будматар'ялы

Мэблевым цэхам камбінату **«Камінтэрн»** за 29 чэрвеня зроблена 216 штук мэблі, што складае 36 проц. праграмы за дзень.

Абутак

Гомельская абутковая фабрыка «Праца» за 25 чэрвеня пашыла 2.116 пар ботаў, 804 пары мужчынскага абутку і 83 пары дзіцячага. Агульны плян за дзень па фабрыцы выканан на 92,7 проц.

За 27 чэрвеня пашыта рознага абутку 2.852 пары, або 88 проц. вытворчай праграмы на дзень.

Гэтай-жа фабрыкай 29 чэрвеня пашыта 1.112 пар ботаў, 449 пар мужчынскіх бацінак і 534 пары дзіцячых. Дзенны плян па фабрыцы выканан на 64,9 проц.

* * *

На працягу чэрвеня на **Менскай абутковай фабрыцы** пашыты 96.552 пары рознага абутку, што дае 98,8 проц. месячнай праграмы.

Кожны пруд і вадаём ператворым у рыбную фабрыку

БССР займае адно з першых месц у Саюзе па багацьці вадаёмамі і запасамі водных рэсурсаў, якія могуць быць выкарыстаны для разьвіцьця прудовай гаспадаркі.

Амаль пяма ніводнага калгасу, на тэрыторыі якога ня было б 3-4 га плошчы, якая запаўняецца сьнегавой і дажджавой вадой. На гэтых плошчах можна весьці аднагадовую карпавую гаспадарку. У дзяржаўных гадавяніках пасадачны матар'ял гадавіка каштуе 5-8 кап. за штуку. Саджаючы на га 400-500 штук, калгас пры затраце на га 25-30 руб. увосень зьпімае 200-250 клг. карпа.

Карп—хуткасьпелая, хуткарастучая рыба. Пасаджаны ўвесну малёк у 50 60 гр. вагой увосень дасягае 500-600 гр.

Пры пераводзе карпавага мяса на пуды, з га мы маем 12-15 пудоў, што раўняецца вазе цялушкі 2-3 год.

Просты арытмэтычны падлік гаворыць аб той вялізарнай карысьці, якая прыносіць калгасу прудовая гаспадарка.

Неабходна весьці растлумачальную работу сярод калгаснікаў і ўсямерна заахвочваць укараненьне гэтага новага ня ў віду гаспадаркі. У гэтай справе патрабуецца актыўная дапамога з боку грамадзкасьці, партыйных і савецкіх арганізацый.

Неабходна выразнае апэрацыйнае кіраўніцтва з боку раённых арганізацый.

Вялікі адыход гадавіка па Беларусі сёлета прынёс значныя страты дзяржаве. На Белым возеры з 110 тыс. штук гадавіка засталося 16,5 тыс. шт.—85 проц. загінула. На Паўлеўцы з 30 тыс. штук засталося 1,5 тыс.—загінула 95 проц. Адыход гадавіка ў Сьляпянскай гаспадарцы складае 95,5 проц.

Сярэдні процант гібелі ад зімоўкі — 25 проц. у той час, як у Маскоўскай вобласьці ў добра ўпарадкаваных гаспадарках гэта лічба даведзена да 10-15 проц.

У чым прычына масавай гібелі гадавіка па Беларусі? Аказваецца, што на Белым возеры ўвесну 1931 г. спэцыялістамі-рыбаводамі ставілася пытаньне перад дырэкцыяй Белрыбтрэсту аб неабходнасьці рамонту зімавальнікаў, якія дрэнна спускаліся вясной і, значыцца, глеба ў іх была закіслая. Трэст патрэбных на рамонт 8 тыс. руб. не адпусьціў і вынікі гэтай «эканоміі» ў наяўнасьці. Па гэтай гаспадарцы страты дасягаюць вялізарных сум. Тая-ж прычына гібелі гадавіка і ў Сьляпянскай гаспадарцы.

У Паўлеўцы гібель гадавіка мяркуюць ад хваробы краснухі (біч для прудавых гаспадарак). Па словах загадчыка гаспадаркі ня было фармаліну для пасылкі рыбы ў Менск з мэтай дасьледваньня па навукова-дасьледчай станцыі. Між тым, маючы простую сталовую соль, можна было да ставіць рыбу на станцыю і сваячасова прыняць меры барацьбы супроць хваробы. Загадчык гэтай гаспадаркі як відаць па знаём з элемэнтарнымі правіламі рыбагадоўлі.

Рыбаразьвядзеньне, як адна з важнейшых крыніц для мабілізацыі дадатковых харчовых рэсурсаў, павінна прыцягнуць да сябе ўвагу ўсёй грамадзкасьці.

А. Пісьменны.

Паведамленьні

— Сьпіс кіраўнікоў, вылучаных Менгаркомам КП(б)Б для правядзеньня мазавага палітдня на прадпрыемствах гораду Менску, прысьвечанага 12-годзьдзю вызваленьня БССР ад белапалякаў. Парыжкоў — зав. імя Варашылава, Гарын («Зьвязда») — зав. «Камунар», Жаброўскі (ЦК) — зав. «Бальшавік», Чарвякоў — зав. імя Молатава, Агульнік (Камвуз) — ф-ка «Камунарка», Шнітко (Гарпрокурор) — зав. «Ударнік», Мятла (БАН) — шклозавод, Курцік (ЦК) — абутковая, Кенін (ГЫК) — Хлебазавод, Рак-Міхайлоўскі (Наркамасьветы) — пічотачная, Рыскін (ЦК) — «Кастрычнік», Некрашэвіч (ДВВ) — друк. імя Сталіна, Войнаў («Зьвязда») — Мясакамбінат, Самуцін («Зьвязда»). — «Беларусь», Зайчык (НКАЗ) — хэмфармазавод, Трус (Гістпарт) — сьпіртазавод, Надальніцкі (Гістпарт) — «Чырвоны хэмік», Альтынская (Камвуз) — БСКА, Ошараў (БАН)—Менсавпрамсаюз, Каждан (ГК КП(б)Б) — Электрастанцыя, Палякоў (Гістпарт) — зав. «Пралетары», Кейлін (Дзяржбанк) — «Беларуская», Дубавіцкі (СНК) — «Чырв. Зорка», Балабашка (НКЮ) — «Чырв. тэкстыльлабашка» (НКЮ) — «Чырв. тэкстыльшчык», Сяонім (ін-т прамысловасьці) — скарняная ф-ка, Аксючыц (Наркамгас) —ф-ка імя 8-га сакавіка, Рудзіцкі (Саўбуд) — «Усход», Галасюк (НКЮ)—ф-ка імя Крупскай, Фрыцман (СНК) — лямпавая, Кукелка (БАН) — Валакаднал, Рудзінскі (ГК КП(б)Б) — харчавікі, Марозаў («Рабочий») — Уціль, Джэлюк («Зьвязда») — ПЭЦ, Сьцепанэвіч (Гістпарт)—цаведьні Менбуду, Сіцько (БАН) — Белдзярэбуд, Платун (НКА) — «Полымя рэвалюцыі», Іваноў (ЦК) — дэпо, Каравэўскі (Гарсавет) — служба шляху, Вальфоўскі (Гарком) — Самэтравэс, Фрэдкін (Гарком) — малы рэмонт вагонаў, Брусевіч (Дзяржплан) — служба руху, Эльканд (СНК) — УНР-6, Вержбаловіч («Рабселькор»)—Дом Ураду, Улазаў (ЦК — абутковая майстэрня, Кулінчыка (ГарКК) — торф. зав. Цна. Рэзэрв: Стракоўскі, Калешта, Выдра, Качапін, Лур'е, Кудрасў, Палей, Бондар, Герцовіч, Варыкоўч, Хейфец, Карочум, Каміншэйн, Альперовіч, Любін, Майзельс, Дабрын, Розэнвауз, Гаўбштэйн, Карчік, Лесненр, Каржанеціч. Кансультацыя адбудзецца 5 ліпеня г. г. роўна ў 7 гадз. веч., у Доме Камсамольцаў (вулка 6). Сакратары парткалектываў павінны дамаўрыцца з вылучанымі кіраўнікамі аб часе правядзеньня мазавага палітдня 7-га ліпеня і сваячасова сабраць пытаньні для кіраўнікоў.

— 4 ліпеня, у 7 гадз. веч., у памяшканьні гаркому КП(б)Б склікаецца нарада вагаворнай ячэек КП(б)Б і парткалектываў. За яўку вагаворнай адказваюць асабіста сакратары парткалектываў і ячэек КП(б)Б.

Адказны рэдактар **М. ГАРЫН.**

5-га ліпеня а 12 гадз. дня

ў Койданаве, Барысаве, Магілеве, Клімавічах, Воршы, Віцебску і Дрысе адкрываюцца

міжраённыя куставыя нарады рэдактароў лепшых насьценных газэт:

У **Койданаве**—раёны: Койданаўскі, Менскі, Заслаўскі і Вузьдзенскі.

У **Барысаве**—раёны: Барысаўскі, Смалявіцкі, Лагойскі, Крупскі, Бярэзінскі, Бягомльскі і Плешчаніцкі.

У **Магілеве**—раёны: Магілеўскі, Бялыніцкі, Клічаўскі, Чавускі і Шклоўскі.

У **Клімавічах**—раёны: Клімавіцкі, Касьцюковіцкі, Крычаўскі, Чэрыкаўскі і Мсьціслаўскі.

У **Воршы**—раёны: Аршанскі, Дубровенскі, Горацкі, Талачынскі, Сенненскі, Чашніцкі і Лепельскі.

У **Віцебску**—раёны: Віцебскі, Лёзьнянскі, Сіроцінскі, Сураскі, Гарадоцкі, Бешанковіцкі.

У **Дрысе**—раёны: Дрысенскі, Полацкі, Вушацкі, Расонскі і Асьвейскі.

Кожным з паказаных раённых раённай вылучаюцца дэлегаты ў складзе 3-х рэдактароў лепшых насьценных газэт і 1-га прадстаўніка раённай конкурснай камісіі.

Адказнасьць за сваячасовую яўку дэлегацый усклада ецца на рэдактароў раённых газэт.

АРГКАМІСІЯ.

8-га ліпеня, у 12 гадзін дня,

у памяшканьні рэдакцыі газэты „ЗЬВЯЗДА" адбудзецца пашыранае пасяджэньне

цэнтральнай конкурснай камісіі пры „Зьвязьдзе",

прысьвечанае падвядзеньню вынікаў конкурсу „Правды" і іншых газэт калгасаў, саўгасаў і МТС на лепшую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклады калёнаважатых—рэдакцый цэнтральных і гарадзкіх газэт аб выніках конкурсу па іх калёнах.

2. Вызначэньне лепшых насьценных газэт на ўсебеларускае сацпярэдніцтва па конкурсе „Правды" і іх прэміяваньне (даклады ўпаўнаважаных цэнтральнай конкурснай камісіі аб выніках правядзеньня міжраённых нарад і высунутых кандыдатах на сацпярэдніцтва).

3. Аб кандыдатах на ўсесаюзнае пярэдніцтва.

На пасяджэньне выклікаюцца ўсе члены цэнтральнай конкурснай камісіі, прадстаўнікі рэдакцый газэт—калёнаважатых, упаўнаважаныя цэнтральнай конкурснай камісіі па правядзеньні міжраённых нарад рэдактароў лепшых насьценных газэт, рэдактары фабрычна-заводзкіх газэт Менску і прадстаўнікоў усіх арганізацый, якія прымалі ўдзел у правядзеньні конкурсу „Правды".

Цэнтральная конкурсная камісія.

Дзяржаўная плянавая камісія пры СНК БССР

СКЛІКАЕ

І-ю ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ ПА ХЭМІЗАЦЫІ

народнай гаспадаркі БССР у 2-й пяцігодцы,

якая адкрываецца 5-VII-32 г. у 6 гадз. веч., у памяшканьні цэнтральнага дому тэхнікі,

З НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:

1) Задачы хэмізацыі народнай гаспадаркі ў 2-й пяцігодцы.
2) Навуковыя прадпасылкі хэмізацыі краіны ў 2-й пяцігодцы.
3) Карысныя выкапні для хэмпрамысловасьці БССР у 2-й пяцігодцы.
4) Хэмічная прамысловасьць БССР у 2-й пяцігодцы.
5) Хэмізацыя сельскай гаспадаркі ў 2-й пяцігодцы.
6) Ласкахэмічная прамысловасьць у 2-й пяцігодцы.
7) Хэмізацыя жывёлагадоўчай гаспадаркі ў 2-й пяцігодцы.
8) Хэмічныя кадры ў 2-й пяцігодцы.
9) Навукова-дасьледчая праца па хэмізацыі ў 2-й пяцігодцы.
10) Работа сэкцый: 1) сыравіны, 2) сельска-гаспадарчая і тукавая, 3) прамысловая, 4) лесахэмічная, 5) кадраў і навукова-дасьледчая, 6) камунальна-бытавая, 7) Харчэ-брадзільная і тлушчавая.

АРГБЮРО.

Летні тэатр саду „ПРАФІНТЭРН" | Сёньня і штодзённа З-ці ЦЫКЛЬ эстрадна-цыркавых паказаў

МЮЗІК-ХОЛ у 2-х аддз.

Пачатак у 9 гадз. Білеты ў рабкасе з 12-2 і з 4-6 гадз веч. ў касе тэатру з 6 з пол. гад.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Новы замежны фільм ЛУЛУ трагедыя ў 7 част. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" — Мастацкі фільм АНУШ Звыш праграмы хроніка Белдзяржкіно

„ПРАЛЕТАРЫ" — ДЗЕННЫЯ ДЗІЦЯЧЫЯ СЭАНСЫ ШЧАСЬЛІВЫ КЕНТ Пач. у 2 г. дня. Каса—з 12 г. дня. Мастацкі замежны фільм КЛІНОК КЭРСТЭНБРУКА драма ў 8 ч. Пач. у 6 гадз.

Кіно „СПАРТАК" АД 2 ЛІПЕНЯ КАТАРГА Драма ў 7 частках Штодзённа 4 сэансы Пачатак у 6 г. 30 м., 8 г., 9 г. 30 м., 11 г. КАСА—з 5 ГАДЗ.

АНОНС! Новы мастацкі прыгодн. фільм ХТО ЯНА? („Враг у порога")

Адкрыты склады для абслугоўваньня патрэб шырокага спажываньня ў гарадох і раёнах: Менску, Віцебску, Полацку, Магілеве, Слуцку, Гомелі, Бабруйску, Воршы, Смаляавічах і Лёзьне, якія прыступілі да водпуску насельніцтву вёскі і гораду розных лесабудматар'ялаў.

Гэтымі днямі на склады паступіць: цэгла, фанэра клеєная і нажаная, абозныя вырабы, дрэўляны вугаль і іншы будматар'ял. Якраз паказаных складаў лесабудматар'ял будзе адну скачка калгаснікам і адноасобнікам бедняцкім і сярэдняцкім праз спажыўсыстэму на мясцох непасрэдна з лесазаводаў і лесправгасаў.

Гастэрарн. аб'яд. Белкавпасаюзу.

Парткалектыў НКЗГандлю, рабочкам, адміністрацыя і калектыў Белпушніны з вялікім жалем паведамляюць аб дачасным сьмерці адказнага работніка Белпушніны, члена КП(б)Б, чырвонаармейца Ф. М. СУЛЬКІНА. Вынас цела с клюбу гарбарэў (рос Камсамольск. і Рэвалюцыйн.) 4 ліпеня ў 5 гадзін.

5 ліпеня г. г., у 1 гадз. дня адбудзецца пасяджэньне інстытуту літаратуры і мастацтва БАН (пам. БАН, 3-ці паверх, пак. № 39), на якім праф. ПІАТУХОВІЧАМ будзе прачытаны даклад „Існуючыя этапы ў разьвіцьці беларускай літаратуры пасьля Кастрычніцкага пераяду". Запрашаюцца пісьменьнікі, удзельнікі рабоч. літгурткоў, аспірантуры, студэнты і ўсе жадаючыя.

Бухгальтары, ст. бухгальтары і інструктары-бухгальтары ПАТРЭБНЫ КІРАЎНІЦТВУ ашчадкасамі і дзяржкрэдыту для працы ў Менску. Зварачацца: Менск, Савецкая, 45.

Магілеўскі палітэканамічны тэхнікум АБВЯШЧАЕ НАБОР НА завочны сэктар на аддзяленьні: мастацкае, бібліятэчнае і школьнае. У тэхнікум прымаюцца: члены КП(б)Б, КСМ і беспартыйныя рабочыя, калгаснікі і беднякі, якія маюць сярэднюю адукацыю. Заявы з засьведчанымі копіямі і дакумэнтамі дасылаюцца ў камандыроўкамі для чмежаў КП(б)Б і КСМ—ад райкому КП(б)Б, для беспартыйных—ад райвана—накіроўваць да 15 верасьня на адрасе: гор. Магілеў, Самсонаўская, 23, завод № 3 у сэктар Магілеўскага політэканамічнага тэхнікуму. Заняткі пачнуцца з 1-га кастрычніка 1932 г.

ТРЭСТУ БЕЛДЗЯРЖКІНО ПАТРЭБНА МАШЫНІСТКА НА СТАЛУЮ ПРАЦУ. Адрас: Менск, Савецкая, 90 2-ці паверх.

ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе дакумэнтаў у газэце „ЗЬВЯЗДА" НЯ ПРЫМАЮЦЦА. Просьба грашовых пераводаў для апублікаваньня да дакумэнтаў у „ЗЬВЯЗДУ" НЕ ПАСЫЛАЦЬ.

ФАШЫСТЫ РЫХТУЮЦЬ ПАХОД НА МЮНХЭН

Баварскі ўрад пераяжджае ў Нюрэнбэрг

БЭРЛІН. **Нацыянал-сацыялісты арганізуюць паходы штурмавых атрадаў у Баварыі і Ангальце.** Мяркуючы па падрыхтаваньнях да гэтых паходаў і перш за ўсё па цыпяроджаньнях іх адказных арганізатараў, **гітлераўскія штурмавікі рыхтуюцца да адкрытай грамадзянскай вайны.**

Аб тым, што 3 ліпеня павінна адбыцца ў Мюнхэне, красамоўна і адкрыта заявілі кіраўнікі акруговых арганізацый штурмавікоў Адольф Вагнэр у Розэнгейме і Гофман у Інгальштадце (Баварыя). Вагнэр заявіў: «У выступленьні, якое арганізуецца ў Мюнхэне, **не павінен прымаць удзелу ні адзін штурмавік, які ў якасьці бацькі сем'і павінен клапаціцца аб спакоі сваіх сваякоў. У гэты паход па вінны адправіцца толькі людзі, якія пакінулі дома свае сем'і».**

Яшчэ больш адкрыта выказаўся палкоўнік Гофман. Па яго словах, з адной толькі Цюрынгіі ў **паходзе на цьямі нацыянал-сацыялістаў. Мюнхэн будуць прымаць удзел 50 тысяч штурмавікоў. Баварскі ўрад пераяжджае з Мюнхэну ў Нюрэнбэрг.** Баварская арганізацыя штурмавікоў чакае дадатковых інструкцый ад германскага вайсковага міністэрства.

У Дэсау (Ангальт) **30 ліпеня выступяць 20 тыс. штурмавікоў. Яны прыбываюць туды з усіх частак Германіі, у прыватнасьці з Бэрліну.** На чале ангельцкага ўраду, як вядома, стаіць нацыянал-сацыяліст Фрэйбэрг, які ўзяў на сабе на нядзелю камандаваньне гарадзкой і правінцыяльнай паліцыяй, адабраўшы гэта права ў обэр-бургомістра Дэсаў. Фрэйбэрг распарадзіўся таксама, каб паліцэйскую службу ў дзень паходу несьлі разам з паліцэйскімі і нацыянал-сацыялістычныя штурмавікі.

Сярод рабочага насельніцтва Дэсаў **панує вялізарнае ўзбуджэньне. Рабочыя вельмі абураны новымі правакацыямі нацыянал-сацыялістаў.**

АГЛЯД ВАЕННА-ФАШЫСЦКІХ СІЛ

Зьлёт „сокалаў" і нарада генштабу ў Празе

ПРАГА. З 1 па 6 ліпеня ў Празе адбудзецца 9-ты зьлёт «сокалаў» «з славянскіх краін». У сучасны момант адбываецца ліхаманкавая падрыхтоўка да зьлёту. З Югаславіі чакаюць 6-7 тысяч удзельнікаў на чале з былым прэм'ерам-міністрам Жыўковічам. З Польшчы чакаюць 2 тыс. чалавек. Аднак у апошнія дні стала вядомым, што па меркаваньнях валютнага характару, польская дэлегацыя будзе скарочана да 200-300 удзельнікаў. Польскую дэлегацыю будзе ўзначальваць вядомы польскі мацархіст граф Замойскі.

Такія-ж дэлегацыі чакаюцца з Баўгарыі, Францыі і Румыніі. Апрача таго, невялікія дэлегацыі прыбудуць з Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы, Бельгіі, Гішпаніі, Галяндыі і інш. У зьлёце «славянскіх сокалаў» прымуць удзел таксама японскія ваенна-спартыўныя арганізацыі на чале з афіцыяльным прадстаўніком ураду.

У «зьлёце сокалаў» прымуць таксама ўдзел вялікія армейскія часьці, якія прадэманструюць перад 400 тыс. наглядальнікаў рад ваенных практыкаваньняў. 5 ліпеня намечаны вялікія ваенныя спаборніцтвы, у якіх мяркуецца ўдзел 12 горных артылерыйскіх дывізій, ваеннай акадэміі і ваенна-інжынэрнай школы. 6 ліпеня з такімі-ж практыкаваньнямі выступіць першая праская дывізія ў складзе 37 тыс. чалавек, 4 артылерыйскіх батальёнаў і 10 эскадронаў кавалерыі. У той-жа дзень выступяць часьці югаслаўскай і румынскай армій. Потым адбудзецца ваенны парад усіх удзельнікаў сакольскага зьлёту. Парад будзе прымаць Масарык, які зьяўляецца вярхоўным камандуючым чэхаславацкай арміі.

На ўрачыстасьцях будуць прысутнічаць начальнікі генштабаў дзяржаў Малой Антанты і Польшчы і французская ваенная дэлегацыя на чале з генэралам Вэйганам і былым начальнікам французкай ваеннай місіі ў Чэха-Славакіі генэралам Мітэльгаўзэрам. Нязвычайна паказальным для характару гэтай ваенна-шавіністычнай дэманстрацыі зьяўляецца ўдзел у зьлёце **белагвардзейскіх ваенна-спартыўных арганізацый,** якія выступяць на зьлёце з асобнымі практыкаваньнямі і прымуць удзел у дэманстрацыях па вуліцах Прагі.

У парадку падрыхтоўкі да «зьлёту сокалаў» у многіх акруговых гарадах па працягу апошніх двух тыдняў адбываліся мясцовыя сакольскія зьлёты з удзелам легіянэрскіх арганізацый і ваенных часьцей. 2-га ліпеня ў Празе адбыліся ваенна-гімнастычныя выступленьні 30 тысяч «маладых сокалаў», у якіх прымалі ўдзел таксама югаслаўскія «сокалы».

Белагвардзейцы абмяркоўваюць у Лёндане новыя антысавецкія правакацыі

ЛЁНДАН. (Уласн. кар. «Правды»). Адбылося закрытае пасяджэньне кіраўнікоў рускай бела-эміграшчыны Англіі. Пасяджэньне адбывалася ў доме былога белага пасла ў Лёндане Саблліна.

Зборышча было склікана ў мэтах выпрацоўкі мер барацьбы супроць прадаўжэньня тэрміну дзеяньня ангельска-савецкай гандлёвай згоды, а таксама ў мэтах скалачваньня інтэрвэнцыянісьцкага фронту.

Пакой, дзе адбывалася пасяджэньне, быў упрыгожан царскімі партрэтамі, сьцягам былога царскага пасольства, іконамі і іншымі белагвардзейскімі рэліквіямі. Але лепшым упрыгожаньнем служыў сакратар англа-рускага камітэту капсэрватыўнай партыі, член парляманту капітан Год, які стар пышствываў на пасяджэньні.

Саблін у сваім уступным слове ліськіва ўхваляў інтэрвэнцыяністкія заклуті Года. Стрыжнем пасяджэньня быў даклад аднаго з ідэйных лідэраў лёнданскіх белагвардзейцаў Байкалава аб «англа-савецкіх гандлёвых адносінах».

Аднак, пад гэтай фармулёўкай захоўвалася нешта іншае: арганізацыя падрыву англа-савецкіх адносін. «Канструкцыйная» праграма Байкалава і яго пьвёрдалобых прыяцеляў заключаецца ў барацьбе супроць прадаўжэньня англа-савецкай гандлёвай згоды, агітацыі за законадаўчае абмежаваньне савецкага імпарту, падрыхтоўцы міжнароднай інтэрвэнцыі супроць СССР, паганьбоючы пікімі сродкамі.

Прыняўшы дэманічную позу, Байкалаў трагічным голасам пагражаў Англіі, у выпадку ня прыняцьця яго праграмы, варожасьцю «рускага народу». Пры гэтым ён напамінаў аб варожасьці, якую «рускі народ» быццам мае да Германіі, што было ўспрынята прысутнымі, як намёк на выстрэл Штэрна.

Напярэдадні працэсу забойцы французкага прэзыдэнта Гаргулава пагрозы Байкалава па адрасе Англіі набываюць вельмі спэцыфічны характар,—гэта пагроза распаўсюджаньня тэрарыстычных актаў белабандытаў па ангельскіх дзеячоў.

Байкалаў з асаблівай нянавісьцю гаварыў аб пасьпяховым разьвіцьці работы РОП (арганізацыя, гандлюючая савецкай нафтай). Ён паведаміў, што ў бліжэйшым будучым рыхтуецца сур'ёзная правакацыя, накіраваная супроць раду мясцовых аддзяленьняў РОП.

25 ліпеня—працэс Гаргулава?

ПАРЫЖ, 1. (ТАСС). Учора вышэйшы касацыйны суд адхіліў касацыйную скаргу Гаргулава. Падставай для касацыі абаронцы высунулі апрача таго, што доктар, які прымаў удзел у мэдыцынскай экспэртызе на быў прыведзен да прысягі, яшчэ і тое, што нібы была парушана працэдура сьледзтва.

Гэт